НУМАРУ 5 кап.

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).
ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.
Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.
Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не варочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. » 3 » — 2 р. 70 к. » 6 » — 4 р. — к. » 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к., месцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок нанпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок нанпарэлі наперадзе тэксту 1 р. — к. За радок нанпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Объяўленьні на 50 проц. даражэй. Зьвыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумэнт 35 кап. За кожны дадатковы 15 ». Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумэнт 15 ». За кожны дадатковы 5 ». Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ... паштова-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 год выданьня — ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. — № 252 (2741) Субота, 2-га лістапада 1929 г.

Бойкі паміж кітайскімі генэраламі.

ПРАЦОЎНЫЯ МАСЫ УМЕШВАЮЦЦА Ў ГЭТЫЯ БОЙКІ, АРГАНІЗУЮЧЫ СВАЕ КАМУНІСТЫЧНЫЯ АТРАДЫ.

Войска Гамінцьзюну наступае

ШАНХАЙ, 31-Х. Водлуг паведамленьня Рэйтэра, у Хэнані адбываецца сапраўдная вайна. Войска Гамінцьзюну (так званая першая народная армія Фынь-Юй-Сяна) вядзе ад Лунхаю шырокі наступ на поўдзень. Урадавае войска накіравана ў сьпешным парадку з Пэйпіну ў Ханькоу і іншыя пункты, якім пагражае найбольшая небясьпека. Рашучыя апэрацыі разьвіваюцца на мяжы. Прыезд Чан-Кай-Шы ў Ханькоу расцэньваецца, як адзнака таго, што ўсе спробы мірна ўпарадкаваць канфлікт пацярпелі крах.

Пэйпін на ваенным становішчы.

Выдан загад аб роспуску саюзу рыкшаў.

ПЭЙПІН, 30-Х. Згодна паведамленьняў, атрыманых з Нанкіну, у Пэйпіне ў бліжэйшыя дні будзе абвешчана ваеннае становішча і выдан загад аб забароне ўсіх публічных сходаў з мэтаю спыніць «анты-ўрадавую дзейнасьць». Нанкінскі ўрад зацьвердзіў загад пэйпінскай ўлады аб роспуску саюзу рыкшаў.

Цяжкае становішча зьняволеных

ТОКІЁ, 31-Х. У Сумбэйскім лягеры каля 100 чалавек захварэлі на фурункулёз. Пытаньне аб галадоўцы не ўпарадкавана. Адміністрацыя не дае магчымасьці праверыць, ці адбываецца галадоўка, завяраючы, што новай галадоўкі няма.

ПАЎСТАНЬНЕ Ў ПРАВІНЦЫІ ГУАНЦЬЗІ.

ШАНХАЙ, 1-ХІ. Газэты паведамляюць, што вывад нанкінскага войска з сельскіх мясцовасьцяў Хубэйскай правінцыі (войска кінута нанкінскім урадам на фронт супроць Фынь-Юй-Сяна) стварыў спрыяючыя ўмовы для аднаўленьня дзейнасьці камуністычных рыкшаў. У правінцыі Гуанцьзі ўжо выбухнула паўстаньне. Вядома, што паўстанцы, пад кіраўніцтвам камуністаў, захапілі паветовы горад Гуанцьзі (на паўднёвым ўсходзе Хубэйскай правінцыі за 60 кілёмэтраў ад Цьзюцьзяну). Ханькоўская ўлада накіравала ў раён паўстаньня адну канаперку і полк нанкінскага войска.

* * *

ШАНХАЙ, 31-Х. Водлуг паведамленьняў газэт, камуністычныя атрады, колькасьцю каля тысячы чалавек аднавілі дзейнасьць у Хайфунскім раёне і захапілі больш 20 вёсак. Мясцовая ўлада зьвярнулася да правінцыйнага ўраду правінцыі Гуандунь з просьбаю аб неадкладнай прысылцы войска.

Напружанае становішча ў Харбіне

Паліцыя разграмляе рэштні рабочых арганізацый.

ТОКІЁ, 31-Х. Становішча ў Харбіне вельмі напружанае. Рэпрэсіі ня спыняюцца. У выніку апошніх арыштаў амаль што зусім разгромлены рэшты рабочых арганізацый. Прызнаньні віноўнасьці, якія водлуг паведамленьняў газэт, нібыта зроблены арыштаванымі, зьяўляюцца вынікам нячуваных катаваньняў у сыскным аддзяленьні.

* * *

ТОКІЁ, 31-Х. Учора на станцыі Харбін кітайскія салдаты зьбілі 4 расейскіх чыгуначнікаў. Гэта затрымала поезд на 40 хвілін.

Умешваньне кітайскай улады ў справы нямецкага консульства.

НАГЛАЯ ТРАЎЛЯ САВЕЦКІХ ГРАМАДЗЯН.

ТОКІЁ, 31-Х. Як паведамляюць з Харбіну, кітайская ўлада зьвярнулася да нямецкага консула Шобэ з патрабаваньнем зволіць усіх савецкіх супрацоўнікаў, прыкамандыраваных да нямецкага консульства для выдачы спраўак. Консул адмовіўся выканаць гэтае патрабаваньне, заявіўшы што нямецкія супрацоўнікі консульства з прычыны вялікага наплыву савецкіх грамадзян, не ўпраўляюцца з працаю.

Улада затрабавала тагды, каб быў допушчан паліцэйскі кантроль над працаю памянёных супрацоўнікаў, а таксама кантроль над раздачай дапамогі савецкім грамадзянам з правам умешвацца ў справы па сутнасьці і аддаваць загады.

Консул адмовіўся выканаць гэтае патрабаваньне; у сувязі з гэтым раздача дапамогі часова спынена.

У СССР.

Устанаўляецца льготны тарыф для перавозкі падарункаў Д.-У. арміі

МАСКВА, 31-Х. Згодна хадайніцтва Рэвалюцыйнага Вайсковага Савету і цэнтральнага савету ТДА-Авіяхіму, НК Шляхаў, пачынаючы з 1-га лістапада, дае выключна льготны тарыф для правозак грузаў з падарункамі войску Далёка-Усходняй арміі і дэлегацыям, якія вязуць гэтыя падарункі.

* * *

2-ая Прыамурская ордэнская дывізія, прыслала цэнтральнаму савету ТДА-Авіяхіму ўдзячнасьць за атрыманыя падарункі.

Рабочыя заводу імя Марты адпрацавалі 2 гадзіны на падарунак для Д.-Усх. арміі.

МІКАЛАЕЎ, 31-Х. Рабочыя заводу імя Марты аднагодна ўхвалілі 20-га лістапада адпрацаваць 2 гадзіны і на заробленыя грошы пасласць падарункі войску Далёка-Усходняй арміі.

Падарунак рабочых заводу „Красный Профинтерн" да 12 угодак Кастрычніка.

БРАНСК, 31-Х. У падарунак ураду да 12-х угодак Кастрычніка рабочыя заводу „Красный Профинтерн" выпушчаюць цягнік і 21 вялікагрузных вагонаў для чырвонага эшалёну. 5-га лістапада поезд, нагружаны 6.000 бочак цэманту, 200 плугоў, якія выпушчаюцца рабочымі акругі таксама звыш праграмы, накіроўваецца ў Маскву.

Працоўныя палякі пратэстуюць супроць арышту членаў рабоча-сялянскай дэлегацыі.

КІЕЎ, 31-Х. Агульны сход працоўных палякаў паслаў у Варшаву на імя камуністычнага дэпутата сойму тав. Росяка тэлеграму, у якой пратэстуе супроць арышту членаў рабоча-сялянскай дэлегацыі, наведаўшай нядаўна СССР, патрабуе іх вызваленьня і пасылае ім шчырае прывітаньне.

Новы лёдакол „Тарос"

ЛЕНІНГРАД, 31-Х. На заводзе імя Марты скончана пабудова лёдаколу «Тарос», магутнасьцю ў 3.600 конскіх сіл. Лёдакол прызначан для абслугоўваньня портаў Чорнага мора.

Лёзунгі да 12-й гадавіны Кастрычніка.

1. Няхай жыве УсеКП(б)—кіраўнік і арганізатар пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва.
2. Няхай жыве КП(б)Б — баявы атрад Усесаюзнай Ленінскай Камуністычнай партыі.
3. Няхай жыве XII-я гадавіна Кастрычніка.
4. Толькі сусьветны Кастрычнік вырве чалавецтва з пекла капіталістычнай эксплёатацыі і імпэрыялістычных войнаў.
5. Знаходзячыся на рубяжы Савецкага Саюзу з капіталістычным Захадам, БССР была, ёсьць і будзе верным фарпостам заваёў Кастрычніка.
6. У адказ на ўзрастаючы ўздым рэвалюцыйнага руху, буржуазія рыхтуе новую вайну супроць Савецкага Саюзу—аплоту пралетарскай рэвалюцыі.

Напружаным тэмпам нашага будаўніцтва зробім непераможнай савецкую краіну ў барацьбе з сусьветным капіталам. Будзем падрыхтаваны да абароны СССР—бацькаўшчыны працоўных усяго сьвету.

7. Імпэрыялісты ў саюзе з сацыял-фашыстамі рыхтуюць контр-рэвалюцыйную вайну супроць СССР. Прэч арганізатараў вайны. Няхай жыве Комінтэрн.
8. Прэч правакатараў новай вайны — кітайскіх мілітарыстых, агентаў сусьветнага імпэрыялізму. Няхай жыве пролетарская рэвалюцыя ў Кітаі.
9. Шчырае прывітаньне рабочым і сялянам Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны і Польшчы ад працоўных БССР у дзень XII-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі.
10. Няхай жыве Чырвоная армія—верны вартавы межаў СССР і БССР.
11. Толькі ў саюзе з брацкімі сацыялістычнымі рэспублікамі, у саюзе Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік забясьпечана палітычнае, эканамічнае і культурнае разьвіцьцё БССР.
12. Магутным уздымам культуры, навукі і тэхнікі забясьпечым пасьпяховае выкананьне 5-хгадовага пляну будаўніцтва сацыялізму, пяратворым СССР у непераможную крэпасьць міравой рэвалюцыі.
13. Дадзім рашучы адпор клясаваму ворагу, які прабуе тармазіць індустрыялізацыю савецкае краіны і сацыялістычную перабудову вёскі.
14. Наша будаўніцтва сацыялізму — частка сусьветнай рэвалюцыйнай барацьбы.
15. Вышэй дысцыпліну, больш арганізаванасьці ў працы. Усе,як адзін, у сацыялістычнае спаборніцтва.
16. Адзіным магутным парывам непераможнай волі працоўных выканаем пяцігодку ў скарочаны тэрмін.
17. Вялікія задачы сацыялістычнага будаўніцтва—у цэнтр профсаюзнай работы.
18. Толькі на падставе шырачайшай самакрытыкі мас, толькі ўцягненьнем мільёнаў у актыўнае абгаварэньне і вырашэньне ўсіх пытаньняў сацыялістычнага будаўніцтва профсаюзы выканаюць сваю задачу—школы камунізму.
19. Узмацніць ролю пролетарыяту і яго практычны ўдзел у сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі.
20. Індустрыялізацыя краіны і калектывізацыя сельскае гаспадаркі — адзіны шлях перамогі цяжкасьцяў сацыялістычнага будаўніцтва.
21. За суцэльную калектывізацыю цэлых вёсак, с-саветаў і раёнаў.
22. За павышэньне якасьці прадукцыі, за зьніжэньне сабекошту.
23. Трэцяя пазыка індустрыялізацыі—буйны ўклад у справу пасьпяховага будаўніцтва сацыялізму. Усямерна замацуем падпіску. Ні воднага сялянскага двара без аблігацыі 3-й пазыкі.
24. Саюз рабочае клясы з асноўнымі масамі сялянства — гэта непераможная крэпасьць, аб якую разаб'юцца патугі паноў і капіталістых.
25. Разьвіцьцё сацыялістычнага будаўніцтва СССР—асноўны шлях зьнішчэньня нацыянальнай розні сярод працоўных. Удзесяцярым нашу энэргію па выкананьню пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва БССР.
26. Толькі ў БССР, як і ва ўсім Саюзе Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, забясьпечана права на палітычнае, эканамічнае і культурнае разьвіцьце працоўных усіх нацыянальнасьцяў.
27. Толькі пралетарская рэвалюцыя да канца вырашыла нацыянальнае пытаньне.
28. Узмацнім інтэрнацыянальную салідарнасьць рабочае клясы і працоўных мас БССР.
29. За бязьлітасную барацьбу з нацыянал-дэмакратызмам — дапаможнікам сусьветнага сацыял-фашызму.
30. Шырока разгорнем масавую самакрытыку, сьмела па бальшавіцкі ўсю працу і ўсё будаўніцтва пад агонь рабочае самакрытыкі.
31. Ачысьцім савецкі апарат ад чужых і разлажыўшыхся, што скажаюць клясавую лінію, бюрократаў і шкоднікаў.
32. Рашучае наступленьне сацыялізму абвастрае супраціўленьне клясавых ворагаў. Узмацнім агонь па кулаку, нэпману, шкодніку і іх пасобніках-бюрократах.
33. За рашучае вылучэньне новых пралетарскіх кадраў на кіруючыя баявыя пасты сацыялістычнага будаўніцтва.
34. За больш актыўны ўдзел працоўных жанчын у сацыялістычным будаўніцтве. За рашучае вылучэньне работніц і батрачак на кіруючую работу.
35. Перамагаючы клясавых ворагаў, узьнімаючы творчасьць мас, праз саветы —будзем будаваць сацыялізм. Наперад да дзяржавы-комуны.
36. Комсамол, шчыльней свае шэрагі вакол камуністычнай партыі, на рашучае змаганьне за сацыялізм.
37. За энэргічную работу па загатоўках бульбы для рабочых Ленінграда і Масквы, праца якіх зьяўляецца асновай бурнага росту індустрыі і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі БССР.
38. Толькі сталёвае адзінства і згуртаванасьць партыі вакол Ленінскага ЦК забясьпечыць пасьпяховае выкананьне задач сацыялістычнага будаўніцтва.
39. За ідэйную вытрыманасьць Ленінскае партыі, за ачыстку яе шэрагаў ад чужых элемэнтаў, за ўзмацненьне партыі новымі моцнымі пралетарскімі кадрамі.
40. За бязьлітасную барацьбу з правымі ухіламі, якія зьяўляюцца галоўнай небясьпекай адыхода ад генэральнай лініі партыі. За бязьлітасную барацьбу з шовінізмамі ўсіх колераў і асабліва на даным этапе з беларускім нацыянал-дэмакратызмам. Супроць „левых" загібаў, за адзінаправільную Ленінскую лінію камуністычнай партыі, не паслабляючы барацьбы з рэшткамі контр-рэвалюцыйнага трацкізму.
41. КПЗБ, змагару з польскім фашызмам і беларускім нацыянал-фашызмам, за інтарэсы рабочых і працоўных сялян, гарачае бальшавіцкае прывітаньне.
42. Перадавыя рабочыя і батракі, уступайце ў шэрагі Ленінскай Камуністычнай Партыі.
43. Сьмелым бальшавіцкім поступам сталёвых ленінскіх шэрагаў уперад, да поўнай перамогі сацыялізму.
44. Няхай жыве пралетарская рэвалюцыя і яе штаб—Камуністычны Інтэрнацыянал.

ЦК КП(б)Б.

У ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

Скандальныя гісторыі навакол пасяджэньня сойму.

Пілсудчыкі тэрарызуюць сойм.

Пасяджэньне сойму адкладзена.

ВАРШАВА, 31-Х. Упэўніўшыся ў немагчымасьці адчыніць пасяджэньне сойму, каля 8-й гадзіны Дашынскі перадаў у друкаванай форме ўсім дэпутатам сойму сваю заяву, у якой гаворыцца, што пад пагрозаю шабляў ён прымушан адкласьці пасяджэньне сойму. Аб дні пасяджэньня сойму дэпутаты будуць паведамлены асобна.

У палітычных колах гэтае здарэньне расцэньваецца, як узброенае папярэджаньне сойму з боку пілсудчыкаў. Сёньня ўвесь сойм адчуў, што адбывалася рэпэтыцыя яго разгону.

Выказваюць недавер'е старшыні сойму.

ВАРШАВА, 1-ХІ. Пасьля абвяшчэньня аб адкладзе пасяджэньня сойму, парляманцкая фракцыя блёку супрацоўніцтва з урадам на сваім пленарным пасяджэньні ўхваліла такую рэзалюцыю: «Абураючае абыходжаньне парляманцкіх прыставоў з афіцэрамі, якія зьявіліся, каб прывітаць маршала Пілсудзкага, павінна разглядацца, як нячуваная зьнявага афіцэраў. Довады старшыні сойму Дашынскага, прадыктаваныя незразумелым страхам перад афіцэрамі, якія прышлі прывітаць свайго правадыра, прасякнуты дэмагагічнай тэндэнцыяй з мэтаю выклікаць трывогу і перапуд. У сувязі з гэтым група супрацоўніцтва з урадам аднагодна рашыла адмовіць старшыні сойму ў давер'і».

Прысуд за прыналежнасьць да камсамолу.

ВАРШАВА, 31-Х. У Лодзі распачаўся разгляд справы 24-х асоб, абвінавачаных у прыналежнасьці да камсамольскай арганізацыі. У якасьці сьведак выступалі выключна паліцэйскія і тайныя агенты паліцыі. Сьведкі абвінавачаньня завяралі, што падсудныя займаліся агітацыяй на фабрыках і заводах. Суд прыгаварыў двух падсудных на 5 гадоў зьняволеньня; 17 падсудных—да зьняволеньня на розныя тэрміны і 2—апраўдаў.

* * *

ВАРШАВА, 30-Х. У Тарнопальскім ваяводзтве, Комчынскага павету, невядомыя асобы падпалілі тэлеграфныя і тэлефонныя слупы на працягу аднаго кілёмэтру. 11 слупоў было параскідана па дарозе. Друк абвінавачвае ў гэтым акце украінцаў, якія імкнуліся, па думцы газэты, выклікаць катастрофу аўтамабілю, у якім павінна была ехаць адна з урадавых камісій.

Выбух.

ВАРШАВА, 31-Х. Як паведамляюць з Вільні, у памяшканьні Віленскага ваяводзтва здарыўся выбух, у выніку якога была зруйнавана частка памяшканьня.

Кампанія супроць савецкіх карэспандэнтаў у Варшаве.

ВАРШАВА, 31-Х. „Кур'ер Чэрвоны" ад нацкоўваньня на карэспандэнта „Известий" Брацiна перайшоў да цкаваньня абодвых савецкіх карэспандэнтаў у Варшаве („Известий" і ТАСС). Сёньня «Кур'ер Чэрвоны» выступае з новымі інсінуацыямі, накіраванымі супроць Брацiна, спрабуючы стварыць навакол Брацiна атмасфэру шпіянажу. Газэта агалашае прозьвішча кватэрнай гаспадыні Брацiна, прычым уся заметка складзена ў такім духу, што выразна відаць жаданьне газэты дамагчыся таго, каб кватэрная гаспадыня адмовіла Брацiну ў кватэры.

„Кур'ер Чэрвоны" ў сваёй кампаніі супроць паўнамоцнага прадстаўніцтва і прадстаўнікоў савецкага друку, як відаць, зьвязан з адпаведнымі аўтарытэтнымі коламі. Гэта даказвае той факт, што згодна загаду старшыні сойму Дашынскага Брацiну ня выдалі карткі на права прысутнасьці на пасяджэньнях сойму, хоць усім чужаземным карэспандэнтам, у тым ліку карэспандэнту ТАСС, гэтыя карткі выдадзены. Такім чынам, Брацiн пазбаўлен звычайных журналісцкіх прывілей. Гэты факт набывае асаблівае значэньне ў сувязі з тым, што Брацiн зьяўляецца сябрам праўленьня клюбу чужаземных журналістаў.

Патрабаваньне тэкстыльшчыкаў аб павялічэньні заработку.

ВАРШАВА, 31-Х. Прафсаюз тэкстыльшчыкаў перадаў саюзу прадпрыёмцаў тэкстыльнай прамысловасьці шэраг новых патрабаваньняў аб павялічэньні заработку, аб сацыяльнай забясьпецы старых рабочых і аб аднаўленьні поўнага рабочага тыдню. З прычыны таго, што гэтыя патрабаваньні будуць, як відаць, адхілены, дык трэба чакаць, што ў тэкстыльнай прамысловасьці таксама выбухне канфлікт.

ВАРШАВА, 30-Х. У Варшаве адбылося 3-хдзённае пасяджэньне так званых „аддзелаў безапаснасьці", якія існуюць ва ўсіх польскіх ваяводзтвах. Нарада, якою кіраваў міністр унутраных спраў Складкоўскі, была прысьвечана пытаньням „безапаснасьці" ў сувязі з уздымам забастовачнай хвалі.

ДА СЭСІІ АНГЕЛЬСКАГА ПАРЛЯМАНТУ.

Чакаецца рэзалюцыя аб аднаўленьні зносін з СССР.

ЛЁНДАН, 31-Х. Рэйтэр паведамляе: „У адказе ў палаце вобшчын на запытаньне Бальдвіна, Сноудэн (выконваючы абавязкі прэм'ера ў адсутнасьці Макданальда) заявіў, што ў аўторак міністр замежных спраў падасьць рэзалюцыю па пытаньні аб аднаўленьні нармальных дыплёматычных зносін з СССР".

Клясавая барацьба ў краінах капіталу.

ЗАБАСТОЎКА ЧЭХАСЛАВАЦКІХ ГАРНЯКОЎ ПРАХОДЗІЦЬ У НАДЗВЫЧАЙНЫХ УМОВАХ.

Узмацніўся нажым з боку рэфармістаў і прадпрыёмцаў.

ПРАГА, 31-Х. Забастоўка гарнякоў у раёне Бруху ў апошнія дні адбываецца ў надзвычайна цяжкіх умовах з прычыны пагоджанага нажыму рэфармістаў, прадпрыёмцаў і ўлады. Наведамляюць аб новых арыштах. Пасьля роспуску забастовачнага камітэту ў Бруху ўлада выдала дадатковы загад, які пагражае рэпрэсіямі ў выпадку выкананьня рабочымі інструкцый забастовачнага камітэту. Орган кампартыі „Рудэ Права" заклікае рабочых да пратэсту супроць апошніх загадаў улады, якія фактычна касуюць права стачкі.

Рабочыя Бруху абураны паводзінамі некаторых камуністаў, членаў фабрычна-заводзкіх камітэтаў, якія сваімі ўчынкамі фактычна дапамаглі рэфармістам, зрываючым забастоўку. Рабочыя патрабуюць выключыць гэтых камуністаў з партыі і прафсаюзу. У сувязі з гэтым кампартыя ўжо некаторых выключыла. У сумежным з Брухам раёне Дукс адбылася канфэрэнцыя гарнякоў, якія выказаліся за салідарнасьць з бастуючымі і за падрыхтоўку забастоўкі ў сваім раёне.

Новыя забастоўкі ангельскіх някоў.

ЛЁНДАН, 30-Х. На каменнавугольных капальнях кампаніі Хартон у Дэргеме забаставала больш за 2500 гарнарабочых. Прычынаю забастоўкі зьяўляецца няўплата кампаніяй ставак заработку, устаноўленых дагаворам.

4000 рабочых выганяюцца на вуліцу.

ЛЁНДАН. Сталеліцейная кампанія Вэйл абвясьціла, што з прычыны недахвату заказаў праз тыдзень станаць усе прадпрыёмствы кампаніі, у сувязі з чым пазбаўляюцца працы больш 4000 рабочых.

Вялікая дэманстрацыя беспрацоўных у Данцыгу.

БЭРЛІН, 31-Х. Як паведамляюць з Данцыгу, там учора, не зважаючы на забарону паліцыі, перад памяшканьнем парляманту адбылася вялікая дэманстрацыя беспрацоўных. Паліцыя некалькі разоў спрабавала разагнаць дэманстрацыю і пушчала ў ход гумовыя кіі. Старшыня данцыгскага парляманту прымушан быў двойчы перарваць пасяджэньне парляманту з-за дэманстрацыі. Камуністычны дэпутат парляманту Кляннікоўскі на пасяджэньні парляманту заявіў пратэст супроць забароны дэманстрацыі і паводзін паліцыі. У адказ на пратэст парлямант выключыў яго на 8 пасяджэньняў. Кляннікоўскі адмовіўся пакінуць залю пасяджэньняў і быў выведзен адтуль пры дапамозе паліцыі.

Сутычка нацыянал-фашызму з камуністамі.

БЭРЛІН, 31-Х. Як паведамляюць з Дусэльдорфу, там учора пасьля перадвыбарчага сходу нацыянал-сацыялістаў (фашыстаў) здарыліся сутычкі між нацыянал-сацыялістамі і камуністамі. Паліцыя, якая ўмяшалася ў сутычкі, дапамагла нацыянал-сацыялістам.

Тыраж „Юманітэ" дасягнуў 200.000.

ПАРЫЖ, 31-Х. У адозьве да чытачоў „Юманітэ" адзначае вельмі добрыя вынікі кампаніі збораў на карысьць „Юманітэ", якія дасягнулі больш 700 тысяч франкаў за 2 месяцы (з моманту спробы разгрому рабоча-сялянскага банку). Вітаючы заснаваньне ўсюды на прадпрыёмствах камітэтаў абароны „Юманітэ" ў адозьве заклікае да яшчэ большага пашырэньня гэтай кампаніі, да прадоўжаньня збораў сродкаў і да далейшага павялічэньня тыражу газэты, які дасягнуў ужо 200.000 адбіткаў.

Страх перад вуліцай.

(Ад нашага варшаўскага карэспандэнта).

З боку можа паказацца, што пэпэсаўскі друк гарыць жаданьнем барацьбы з урадам Пілсудзкага. Чым толькі не пагражаюць і чаго толькі не жадаюць ураду Сьвітальскага пэпэсаўскія лідэры. Тут і народны гнеў, і абвостраная пэпэсаўская апазіцыя, і адказнасьць перад гісторыяй. Не забыты, зразумела, і падрыў аўтарытэту Польшчы на Захадзе і пагрозу вотумам недавер'я ў сойме і незадаволеньнем ІІ-га Інтэрнацыяналу, які да рэчы сказаць, нядаўна прыслаў у Польшчу сваіх прадстаўнікоў у асобе Вандэрвэльдэ, Лебэ і інш., каб засьведчыць незадаволеньне гэтай міжнароднай арганізацыі здраднікаў роляю і месцам, адведзеным ППС у польскай фашысцкай сыстэме.

Калі-б пілсудчыкі хоць часткова паверылі пагрозам пэпэсаўскага друку, яны неадкладна зьмянілі-б свае пляны і здалі-б уладу ППС, а пэпэсаўцы абвясьцілі-б тады эру цудоўнага выратаваньня «дэмакратыі» і над польскім парлямантам, што на Вейскай вуліцы, высока быў-бы ўзьняты сьцяг.

З скліканьнем сойму папяровы гнеў ППС расьце. Растуць папяровыя рэзалюцыі,накіраваныя то супроць асобных міністраў, то супроць ураду ў цэлым. Улічаныя ўжо ня раз у сваіх шальмоўствах палітычныя прайдзісьветы з ППС у сучасны момант клянуцца на старонках сваіх газэт, што не адступяць ні на крок ад сваёй «прынцыповай апазіцыйнасьці». Лідэры без партфэляў б'юць сябе ў грудзі і моляць— паверыць ім хоць яшчэ адзін раз, бо цяпер сапраўды ўсур'ёз ужо спынена сувязь ППС з урадам. Цяпер яны ўжо не спалохаюцца зьвяганьня палкоўніцкіх шпор і ня кінуцца пераглядаць свае пазіцыі па першаму загаду паліцэйскага.

Баронячы сябе рознымі „надзвычайна рэвалюцыйнымі" рэзалюцыямі, ППС не забывае ўсё-ж аб тым, што час ад часу неабходна супакойваць сваіх гаспадароў. «ППС ня зыдзе з шляху законнасьці"—завярае пэпэсаўскі лідэр Недзялкоўскі. «Мы ня пойдзем на гвалтоўны пераварот, бо ён можа ператварыцца ў сацыяльную рэвалюцыю",—навучае, панюхаўшы троха марксызму другі волат ППС Чаплінскі.

ППС пасьлядоўна праводзіць сваю двурушніцкую палітыку да канца. Чым больш рэвалюцыйных рэзалюцый, тым больш здрадніцтва. Маршал сойму—лідэр ППС Дашынскі—накіроўваецца да Пілсудзкага папярэдзіць яго аб тым, што незадаволеньне мас расьце і ў цяжкі для ўраду момант, як лідэр парляманцкай апазыцыі, лічыць неабходным прапанаваць Пілсудзкаму свае паслугі. Прафсаюзным лідэрам ППС дадзена дырэктыва ні ў якім выпадку не дапускаць ні аднае хоць нязначнае забастоўкі. І зразумела чаму: нельга ў такі момант бударажыць масы, бо невядома хто захопіць кіраўніцтва ў свае рукі. Таму ППС утойвае ўсякую забастоўку, бо масы не павінны ў цяжкі для ўраду момант выйсьці на вуліцу.

Хвалююцца беспрацоўныя--і ППС цалкам пакідае поле дзейнасьці камуністам. Нарастае забастовачная хваля сярод мэталістаў, і пэпэсаўскія прафсаюзьнікі робяць выгляд, нібы яны руху ня прыкмячаюць, і ня склікаюць за ўвесь час ні аднаго сходу. Заўважваецца рух сярод варшаўскіх камунальнікаў, але ППС ня прымае ў ім удзелу, з прычыны яго... палітычнага характару.

ППС яўна ўхіляецца ад рабочых, імкнучыся тайна ўсялякім чынам перашкаджаць выхаду рабочых на вуліцу. Затое ППС штодзень трактуе рабочую клясу значнай порцыяй „левых апазыцыйных сказаў".

Так праводзіцца „барацьба" ППС з урадам за „дэмакратыю і парлямантарызм". Але здараецца і так, што, наперакор жаданьням пэпэсаўскіх лідэраў, рабочыя ўсур'ёз прымаюць папяровыя рэзалюцыі, якімі іх кормяць. Тады здараюцца такія непаразуменьні, якія мелі месца ў часе апошняга юнацкага дню, арганізаванага пэпэсаўскімі спартыўнымі арганізацыямі.

Вялікі жах агарнуў „правадыроў", вышаўшых на вуліцу, калі моладзь выкінула лёзунг: „Прэч урад Пілсудзкага". Але калі гэтым „правадырам" паведамілі, што пасьля першай сутычкі з паліцыяй моладзь падтрымала і падхапіла лёзунг: „Прэч самаго Пілсудзкага"—іх спалох нельга апісаць.

Пэпэсаўская моладзь дорага заплаціла за сваю наіўнасьць. Яна была разагнана паліцыяй, а лідэры на другі дзень адмовіліся ад яе і выдалі яе з галавой, заявіўшы, што лёзунг быў выкінуты не пэпэсаўцамі, а падасланымі правакатарамі.

У гэтых „непаразуменьнях" хаваецца прычына сьмяротнага страху перад вуліцай.

А. Р.

Рабочыя адзінадушна падтрымліваюць рашэньне кампартыі

аб выключэньні з партыі Ляпарта і Лёза.

ПАРЫЖ, 31-Х. Выступаўшыя на скліканым кампартыяй у Сэн-Дэні (ваколіца Парыжу) мітынгу, выключаныя з партыі за ўдзел разам з сацыялістамі ў падарожжы ў фашысцкую Вэнгрыю, Ляпарт і Лёз спрабавалі апраўдацца, але былі асьвістаны рабочымі, якія бурна выказалі сваё абурэньне. У аднагодна ўхваленай рэзалюцыі зазначана: „Рабочыя Сэн-Дэні, заслухаўшы растлумачэньне аб выключэньні з кампартыі недысцыплінаваных муніцыпальных дарадчыкаў-камуністаў, выказваюць поўную салідарнасьць з кампартыяй, ганьбяць нявытрыманасьць выключаных, патрабуюць ад іх неадкладнай здачы муніцыпальных мандатаў, атрыманых ад рабочых выбаршчыкаў, абавязуюцца змагацца за кампартыю, „Юманітэ", за вызваленьне палітычных зьняволеных, за абарону пераможнай Кастрычнікавай рэвалюцыі». Мітынг прайшоў з выключным уздымам.

КЛЕМАНТАЛЬ АДМАЎЛЯЕЦЦА АД ФАРМАВАНЬНЯ ГАБІНЭТУ

ПАРЫЖ, 31-Х. Гавас паведамляе, што Клемантэль перарваў перамовы аб складаньні ўраду. Лічыцца амаль што бясспрэчным, што ён адмовіцца ад складаньня ўраду.

Працоўныя нэгры Паўднёвага Уэльсу падкрэсьліваюць сваю салідарнасьць з рабочымі СССР.

ЛЁНДАН, 30-Х. Орган ангельскай кампартыі „Уоркерс Лайф" паведамляе, што ў Паўднёвым Уэльсе адбыўся мітынг нэграў-маракоў, якія ўхвалілі па дакладу члена ЦК ангельскай кампартыі т. Радштэйна рэзалюцыю з прывітаньнем дэлегацыі ангельскіх рабочых, якая накіроўваецца ў СССР. У рэзалюцыі падкрэсьліваецца салідарнасьць нэграў з рабочаю клясаю СССР і выказваецца глыбокі жаль з прычыны немагчымасьці з-за беспрацоўя паслаць разам з дэлегацыяй ангельскіх рабочых дэлегата ад нэграў.

Галадоўка палітвязьняў працягваецца.

ВЕНА, 30-Х. Водлуг паведамленьняў з Будапэшту, галадоўка палітычных зьняволеных прадаўжаецца ў поўным абхваце. Бэтлен учора атрымаў пратэст ад шэрагу дзеячоў захаду, якія дамагаюцца здаволеньня патрабаваньняў палітычных зьняволеных.

Рост беспрацоўя ў Амэрыцы.

Форд зволіў 30 тысяч рабочых.

НЬЮ-ЁРК, 31-Х. Як паведамляюць з Дэтройту (цэнтр аўтамабільнай прамысловасьці Злучаных Штатаў), наглядаецца вострае скарачэньне вытворчасьці ў аўтамабільнай прамысловасьці. На прадпрыёмствах Форда за апошнія тыдні звольнена 30 тысяч рабочых.

* * *

НЬЮ-ЁРК, 31-Х. У найбольш багатых сельска-гаспадарчых штатах Мэксікі, Коагуйлы і Дуранго наглядаецца значнае павялічэньне беспрацоўя і беднасьці сярод насельніцтва ў сувязі з неўраджаем хлеба.

Францускі ўрад забараніў праезд у СССР рабочай дэлегацыі.

ПАРЫЖ, 1-ХІ. Францускі ўрад адмовіў у выдачы заграніцых пашпартоў рабочым і работніцам, абраным на прадпрыемствах у склад дэлегацыі на Кастрычнікавыя ўрачыстасьці ў СССР.

Задача падарожжа Макданальда ў Амэрыку выканана(?).

ЛЁНДАН, 1-ХІ. Сёньня раніцою Макданальд вярнуўся ў Англію. У гутарцы з журналістамі Макданальд заявіў, што на яго думку, задача яго падарожжа ў Амэрыку выканана.

Загатоўкі—баявая задача.

Загатоўкі лёну праходзяць надзвычайна слаба.—Неабходна распачаць кампанію па захаваньню бульбы ў капцох. Кулаччо імкнецца ўхіліцца ад мер грамадзкага ўзьдзейнічаньня. Сачэце за манэўрамі клясавага ворага.

УЗМАЦНЯЙЦЕ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІ БЛЁК СУПРОЦЬ КУЛАКА.

Забыты вучастак фронту.

Нашы загатоўчыя арганізацыі пры разгортваньні загатовак хлеба і бульбы зусім забыліся яшчэ аб адной вельмі важнай задачы, якая стаіць перад імі—гэта аб разгортваньні загатовак валакна.

Сёлета збор лёну з палёў быў праведзен куды раней, чым летась. Здавалася, што і загатоўка валакна лёну павінна была распачацца раней. Між тым месячны плян у кастрычніку выканан да 25 усяго толькі на 19 пр. Зусім кепска праходзіць загатоўка валакна ў акругах інтэнсыўнага лёнаводзтва: у Магілеўшчыне месячны плян за 25 дзён кастрычніка выканан на... 5,9 проц., у Полаччыне—на 9,4 пр. і ў Аршаншчыне—на 11,4 проц.

У Гомельшчыне і Меншчыне загатоўка валакна лёну нават яшчэ і не распачата.

Дрэнна таксама стаіць справа і са зборам закантрактаванага валакна. Сыстэма сельска-гаспадарчай каапэрацыі, відаць, працуе ў гэтай галіне па „добрай, старай традыцыі“—збор закантрактаваных культур у апошнюю чаргу. Больш таго, Белсельсаюз ня мае ніякіх вестак аб ходзе збору закантрактаванага валакна і гэта ў той час, калі кантрактацыя складае ў ле пляне загатовак гэтай сыравіны 85 пр. і 45 проц. агульнага пляну загатовак валакна. Нашы загатоўцы, як і летась, сядзяць і чакаюць, пакуль селянін сам прывязе да іх валакно.

Савецкі апарат і ў першую чаргу акргандлі павінны неадкладна праверыць наколькі нашы нізавыя загатоўчыя апараты падрыхтаваны да разгортваньня загатовак валакна. Працаўнікі нізавых загатоўчых апаратаў разам з каапэрацыйным і наогул вясковым актывам павінны растлумачыць селяніну яго абавязак перад дзяржавай датэрмінова здаць закантрактаванае валакно, тым больш, што кантрактанты ўжо атрымалі 60 пр. належачага ім па дагаворах хлеба. Неабходна на сходах кантрактантаў перагледзіць тэрміны здачы закантрактаванага валакна ў бок іх скарачэньня.

Зразумела, кулацтва і заможная частка вёскі будзе рабіць нам усялякія перашкоды, каб сарваць выкананьне загатоўчага пляну па валакну. У нас ёсьць добры вопыт у хлебазагатоўчай кампаніі, калі пляны даводзіліся да асобных вёсак і асобных кулацкіх і заможных гаспадарак. Гэты вопыт даў добрыя вынікі і яго трэба скарыстаць у кампаніі па загатоўцы лёну.

З практыкі мінулых гадоў мы ведаем, што сяляне часта здавалі валакно нізкай якасьці (дрэнная апрацоўка, падмачваньне і г. д.), а таму асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на якасьць валакна. Побач з гэтым загатоўчыя арганізацыі і акргандлі павінны забясьпечыць здатчыкаў валакна сваечасова і на месцы здачы лёну хлебам і прамтаварамі па нормах, якія ўстаноўлены эканомнарадай.

Больш увагі якасьці бульбы.

Ці была зьвернута да гэтага часу належная ўвага на якасьць здаваемай бульбы? Ці сачаць на мясцох за тым, каб бульбу здавалі ня гнілую, ня вільготную? Па тых вестках, якія атрымоўваюцца з месц, ёсьць пагроза, што ня ўсюды гэтыя правілы выконваюцца. Проста сачылі за колькасным эфэктам, а не за якасным. Можна ўявіць сабе, што стане пазьней з бульбай у складах, калі будуць здаваць усякую гніль!

Па Белсельтрэсту мы маем такі выпадак, калі ў саўгасе Антанопаль было заражана мокрым гнільцом 10.000 пуд. бульбы, якую ні ў якім выпадку нельга ўжываць на харчаваньне чалавеку. Гэта справа была выкрыта, і інспэктар па Менскай акрузе т. Анціпенка аддаецца пад суд. Калі па абагуленаму сэктару за гэтай справай можна сачыць, дык пры прыёме бульбы ад індывідуальных гаспадарак амаль ніхто не сачыць.

У сучасны момант трэба зьвярнуць пільную ўвагу на гэта пытаньне, якое мае надзвычайна вялікае значэньне, на мясцох трэба ўзмацніць нагляд за якасьцю здаваемай бульбы.

Кампанія за захаваньне бульбы ў капцох.

У сучасны момант загатоўка бульбы разгарнулася шырока. Белсельтрэст ужо выканаў заданьне поўнасьцю. Белкаапсаюз і с.-г. каапэрацыя актыўна праводзяць загатоўку. Але зараз мы сталі перад такім фактам, калі чыгункі не пасьпяваюць забіраць загатоўленую бульбу. Такое становішча пры сучаснай дажджлівай пагодзе і надыходзячых маразох стварае небясьпеку, у выніку чаго можа сапсавацца вялікая колькасьць бульбы.

У зьвязку з гэтым, трэба падумаць аб тым, каб захаваць загатоўленую бульбу на мясцох да вясны, калі мэтэоролёгічныя ўмовы ня будуць перашкаджаць перавозцы яе. Адзіным выхадам з такога становішча зьяўляецца хаваньне бульбы ў капцох і там дзе можна, у ямах ці ў скляпох.

Белкаапсаюз па сваёй лініі даў дырэктыву аб тым, каб пасьля выкананьня ўсіх адгрузак прамысловасьці і інш. нарадах спыніць вываз бульбы на станцыі чыгунак. Бульбу трэба захаваць на мясцох, дзеля якой мэты з сялянствам павінны быць заключаны спэцыяльныя ўмовы.

Апроч гэтага, усім ЦРК запрапанавана ўзмацніць раздачу бульбы працоўнаму насельніцтву.

На апошнім пытаньні трэба спыніцца больш падрабязна. Па гарадах амаль у кожнай кватэры маюцца скляпы, у якіх можна зьмясьціць вялікія запасы бульбы; насельніцтва чамусьці адносіцца незацікаўлена да гэтай справы. Нашы ЦРК павінны павесьці шырокую кампанію сярод пайшчыкаў, каб зараз распачаць разьмяркоўваньне бульбы. Гэтым можна назапасіць назіму вялікую колькасьць бульбы.

Пасылаем бульбу ў Маскву і Ленінград.

Загатоўка бульбы для пралетарскіх цэнтраў на Віцебшчыне разгарнулася шырокім тэмпам. 26 кастрычніка на Маскву і Ленінград былі накіраваны 2 першых эшалёны бульбы па 60 вагонаў кожны. 27 кастрычніка з Гарадка ў Ленінград накіраван эшалён у 67 вагонаў.

З раёнаў па загатоўцы бульбы ідуць на першым месцы—Чашніцкі, які на 28 кастрычніка адгрузіў 34 вагоны, Лёзьненскі—16 і Сеньненскі, дзе плян загатовак выканан з перавышэньнем. Па гэтаму раёну загатоўлена 350 тыс. пуд. замест 300 тысяч.

Збор мяшкоў таксама абяцае даць добрыя вынікі. Актыўны ўдзел у гэтай працы прынялі дэлегаткі, якія збор мяшкоў праводзяць мэтадам спаборніцтва. На Віцебскім чыгуначным вузьле за 2 дні было сабрана звыш 500 мяшкоў.

(Віцебская акруга).

Ул. Буслаў.

Скрыўленьні клясавай лініі ў хлебазагатоўках.

(Мазырская акруга).

Па пытаньню хлебазагатовак на мясцох ёсьць цэлы шэраг дырэктыўных указаньняў і ня гледзячы на гэта ў раёнах Мазырскае акругі назіраецца шмат скрыўленьняў клясавай лініі.

Назіраецца недапусьцімая ўраўнілаўка пры разьмеркаваньні заданьняў, з раскладкаю па ўсіх дварах у тым ліку на беднату і маламоцныя серадняцкія гаспадаркі (Азарыцкі і інш. раёны).

Па цэламу шэрагу сельсаветаў заданьне ня толькі не даведзена да двара, але і не даведзена да вёсак (Азарыцкі раён), а ў некаторых вёсках яшчэ і да гэтага часу ня зломлена супраціўленьне кулацка-заможных груп вёскі ў справе здачы дзяржаве лішкаў хлеба. Ніхто з арганізатараў супраціўленьня дзяржаўных хлебазагатовак ня прыцягнуты да судовай адказнасьці, а таму кулацтва імкнецца зрываць мерапрыемствы савецкае ўлады. Трэба будзе ўзяць рашучы курс у адносінах да кулацкіх элементаў.

Сельскія камісіі садзейнічаньня хлебазагатоўкам у большасьці сваёй бязьдзейнічаюць і кіраўніцтва апошнімі з боку райвыканкомаў адсутнічае, сацыяльны склад гэтых камісій правераны недасткова, у выніку чаго наглядаецца засьмечанасьць камісій заможнікамі і кулакамі, якія імкнуцца захаваць лішкі хлеба ў кулакоў і перакласьці хлебазагатоўкі на плечы беднаты.

Надзвычайна павольна праводзіцца збор закантрактаванага хлеба і бульбы, а сельска-гаспадарчая каапэрацыя, райвыканкомы і сельсаветы ў гэтым напрамку зусім бязьдзейнічаюць.

Наглядаецца недапушчальна слабая здача лішкаў хлебу як з боку саўгасаў, а таксама і калгасаў.

Разам з гэтым высьветлілася напружанае становішча з хлебнымі складамі і непрыняцьце сваечасовых мер, як з боку райвыканкомаў, а таксама і спажывецкай каапэрацыі ў справе падшуканьня адпаведнай плошчы будынкаў для складаў.

Дрэнна абстаіць справа на Мазыршчыне і з націскам на млынаўласьнікаў, якія ўхіляюцца ад сваечасовай здачы памольнага збору. Ня гледзячы на ўсё гэта ніводзін млынар ня прыцягнуты да адказнасьці.

Райвыканкомы і камісіі садзейнічаньня не ўстанавілі цьвёрдых норм па культурах у кожнай вёсцы, у выніку чаго частка сялянства і асабліва кулацтва імкнецца здаваць грэчку, проса і іншыя малакаштоўныя культуры замест жыта.

Усё гэта стварае небясьпеку і пагрозу сваечасоваму выкананьню хлебазагатовак.

Пералом у хлебазагатоўках на Мазыршчыне павінен быць зроблен.

С. Лодысеў.

Кулак захаваўся за беднату

Хлебазагатоўкі на Аршаншчыне праходзяць добра. Дняпросаюз выканаў свой гадавы хлебазагатоўчы плян—заданьне на 92 проц. Таксама добра выконваюць загатоўкі і іншыя хлебазагатаўцы. Дняпросаюз ужо мяркуе поўнасьцю выканаць сваё гадавое заданьне да 12 гадавіны Кастрычнікавае рэвалюцыі. Выканаюць свае заданьні да паказанага ім тэрміну і астатнія загатаўцы. Хлеб цяпер арганізаваным парадкам ідзе кожны дзень на склады загатоўчых пунктаў. У гэтым напрамку справа абстаіць здавальняюча.

Вось толькі дрэнна ў тым, што новы мэтад хлебазагатовак на вёсцы прайшоў без дастатковага клясавага падыходу і ў большасьці вёсак Аршанскай акругі кулак, маючы вялікія лішкі хлеба, здаў столькі сама дзяржаве, колькі здалі бедныя з серадняками. Выкананьне заданьняў вёскамі ў сваёй большасьці праводзілася так: на сходы па гэтаму пытаньню перш за ўсё давалі хлеб бедната і серадзякі. Бедната і серадзякі тут-жа на сходзе давалі гэты хлеб сьвядома, жадаючы дапамагчы дзяржаве. Кулакі і заможнікі ў гэты час сядзелі на сходцы і чакалі колькі дасьць хлеба бедната і колькі пасьля застанецца на іх долю. І ў выніку гэтага аказалася, што кулаку і заможніку заставалася даць хлеба з сваіх лішкаў па столькі-ж колькі дала бедната і серадзякі, а ў некаторых выпадках і значна менш.

Адным чынам, дзякуючы такому разьмеркаваньню заданьня, такому яго выкананьню, кулакі свае лішкі хлеба ня здалі. Здарылася гэта з прычыны таго, што некаторых вёсках бедната раней за ўсё не абгваарвала, якім чынам патрэбна выканаць заданьне, што беднага ня ведала аб тым, што дзяржава хлеб у беднаты ня хоча браць, што хлеб патрэбна ўзяць у кулака і заможніка, бо ў яго ёсьць лішкі, а ў беднаты няма. Бедната павінна толькі дапамагчы дзяржаве ўзяць лішкі хлеба ў кулака, а не праводзіць выкананьне так, каб кулак захоўваў свае лішкі па-за плячыма беднаты.

З другога боку ў камісіі садзейнічаньня хлебазагатоўкам ва многіх вёсках трапілі кулакі, альбо іх сыны, заможнікі. Яны пасьля і праводзілі такую палітыку, каб давалі раней бедната і серадзякі, хто колькі зможа даць, а пасьля ўжо кулакі і заможнікі.

У вёсцы Новае сяло Межаўскага сельсавету, Аршанскага раёну, у камісію садзейнічаньня трапіў сын кулака Казакевіча. Дзякуючы гэтаму, усе кулакі—заможнікі здалі разам з беднатой па тры пуды хлеба, у той час, як яны маглі здаць па 25—30 пудоў.

У в. Рудкаўшчына, там-жа, дзе знаходзіцца і сельсавет, у камісію садзейнічаньня пралез кулак Кавалеўскі. Ён і свае пуды хлеба прывёз разам з беднатой, з чырвоным абозам. Сельсавет аб гэтым нібы і ня ведаў. Гэта ўжо выкрыта брыгадай саюзу саўгандальслужачых, якая рабіла налёты на загатоўчыя пункты.

У некаторых сельсаветах Талачынскага раёну таксама ёсьць такія зьявішчы. Кулак Пажарыцкі даў 10 пудоў, тады калі ён мог даць 75—80 п. Другі кулак Баравік здаў 25 п., у той час як ён мог лёгка здаць 100 п. Гэта самае ёсьць і ў іншых сельсаветах Талачынскага раёну.

У адной з вёсак Ляднянскага раёну загадчык хаты-чытальні, які праводзіў сходку па хлебазагатоўках, дапусьціў раскласьці ўсю норму роўнымі часткамі на кожны двор. У гэтым-жа раёне, у в. Дрэяўка, кулакі агітавалі сярод беднаты і серадзякоў хлеб не здаваць, бо будзе вайна і тады застануцца ўсе бяз хлеба.

Такія зьвесткі, якія гавораць аб тым, што кулак свае лішкі дзяржаве ня здаў, што ён здаў два-тры пуды аднолькава з беднатой і за плячыма беднаты захаваў свае лішкі—[illegible] з усіх раёнаў. Гэта самае сьведчыць і тое, што кулакі маўчаць, што з іх боку няма скарг, бо новым мэтадам хлебазагатовак кулакі засталіся задаволенымі. І ўсё гэта з прычыны таго, што ва многіх сельсаветах ня ведалі клясавай устаноўкі ў гэтым пытаньні, а бедната дрэнна арганізавана і таксама ня ведала што рабіць і як абараняць свае правы, як дапамагчы дзяржаве ўзяць у кулака лішкі хлеба.

Ёсьць выпадкі, калі бедната і серадзякі, добра зразумеўшы новы мэтад хлебазагатовак, усю дадзеную норму на вёску расклалі толькі на кулакоў і заможных, а самі ўжо давалі пасьля, колькі маглі, каб дапамагчы дзяржаве. Так павінна была рабіць бедната ўсюды. Бедната павінна была прымусіць кулака здаць дзяржаве свае лішкі. Яна павінна была ўсюды норму раскласьці на кулакоў і заможных, а не даваць сама ў першую чаргу, каб гэтым самым даць магчымасьць кулаку пакінуць свае лішкі хлеба.

Там, дзе клясава правільна былі праведзены загатоўкі, там, дзе бедната прымусіла кулакоў здаць свае лішкі, там кулакі крычаць, што гэта ім вельмі цяжка і ў некаторых раёнах з боку кулакоў ёсьць ужо помста актыўным сябрам камісій садзейнічаньня. У Горацкім раёне, у в. Ніколянка, селянін Туркоў—сябра камісіі садзейнічаньня, усклаў 60 пудоў на аднаго кулака, даволі моцнага, які гэту норму выканаць мог. Гэты самы кулак пасьля, каб адпомсьціць Туркову, спаліў яго гумно. У Талачынскім раёне на глебе разьмеркаваньня нормы на кулакоў, зроблена забойства сябра камісіі садзейнічаньня.

Вось як адказваюць кулакі на клясавы наступ на іх беднаты. Пралетарскі суд жорстка пакарае кулакоў за гэта і адаб'е ахвоту помсьціць беднаце. Бедната павінна рашуча праводзіць сваю клясавую лінію, выкрываючы і тых сельсаветчыкаў, якія даюць кулакам палёгкі і скрыўляюць клясавую лінію.

А. Калюжны.

Абураючае галавацяпства,

(Бярэзінскі р-н, Менск. акр.).

Чырвоныя абозы прывезьлі ў м. Бярэзіна тры тысячы пудоў бульбы. Загатаўцы абяцалі, што гэту бульбу пагрузяць на баржу. Прыехалі да берагу ракі Бярозы—баржы няма. Згрузілі бульбу на бераг.

Ляжыць бульба на беразе дзень, другі, трэці; увесь тыдзень чакае баржы. Ад дажджу бульба гніе, ад марозу—мерзьне. Вялікую частку яе прыдзецца выкінуць, як брак.

Сяляне абураны галавацяпствам загатаўцаў. Яны патрабуюць прыцягненьня да адказнасьці вінаватых у гэтай справе.

Зоркае Вока.

У наступ на кулака.

Маслоўскі сельсавет, Капыскага раёну, Аршанскае акругі ва ўсю шырыню разгарнуў працу хлебазагатовак. Па ўсіх вёсках праведзены сходы сялян. Можна падвесьці некаторыя вынікі.

Бедната арганізавана дапамагае выкрыць лішкі ў кулакоў і ў заможнікаў і сама ідзе наперадзе. У выніку арганізаванасьці беднаты і серадняцкай часткі вёскі: Варкова, Анікавічы, Стрыкілі і інш. выканалі ад 120 да 208 проц. заданьня. У дзень ураджаю і калектывізацыі быў арганізаваны чырвоны абоз. Складзены па вёсках камісіі садзейнічаньня хлебазагатоўкам. Плян хлебазагатовак даведзены да кулацка-заможнага двара.

Адным з недахопаў трэба лічыць тое, што некаторыя працаўнікі не паставілі належным чынам тэхнікі хлебазагатовак, у выніку чаго вёскі: Тудараўка, Кустоўка ня выканалі заданьня. Кулакі шкодна дзейнічаюць, але іх дзейнасьць разьбіваецца аб бядняцка-серадняцкі блёк. Гэта гаворыць, што заданьне па хлебазагатоўках будзе выканана.

Капыскі р., Аршаншчына.

А. Вертліб.

Безгаспадарчасьць на складзе.

(Капыльскае спажывецкае т-ва).

Склад з малымі, нізкімі, вузкімі перагародкамі. Авёс сыплецца ў пшаніцу, жыта зьмешваецца з грэчкаю. Каля вагі рассыпаюцца на падлогу сотні пудоў аўса, які мяшаецца з гразьзю ад сялянскіх ботаў. Вага стаіць у вузкім праходзе, дзе нельга перавярнуцца тром чалавекам. Цераз нізкія перагародкі засекаў высыпаецца пад ногі збожжа. Самы склад падобен да склепу: у ім адсутнічае ўсялякая гігіена, сьцены не пабелены, няма вэнтыляцыі.

Прыёмшчык марудны і непаваротлівы: увесь дзень трэба патраціць, каб дачакацца чаргі, хаця і чарга невялікая.

Такі выгляд збожжавага складу Капыльскага спажывецкага таварыства.

А. Странок.

Прэзыдыум сельсавету абараняе кулакоў.

(Крычаўскі раён, Магілеўшчына).

Кулакі актыўна выступаюць супроць хлебазагатовак. Яны скарыстоўваюць усе магчымыя сродкі, каб сарваць працу вясковых камісій у напрамку давядзеньня пляна́ў да кулацкіх гаспадарак. Кулакі склікаюць свае сходы.

Замест таго, каб моцна і з усёй рашучасьцю даць належны адпор кулацкім хітрыкам і вылазкам, Прэзыдыум Паланіцкага сельсавету зьяўляецца абаронцам кулакоў. Прывядзём факты, якія малююць відавочна скрыўленьне клясавай лініі Паланіцкім сельсаветам.

Пры абгаварэньні канкрэтных плянаў і лічбаў, атрыманых з РВК, Прэзыдыум сельсавету габінэтным парадкам, бяз удзелу беднаты і сераўняцкага актыву, зрабіў ураўнілаўку і гэтым самым абараніў кулацкія гаспадаркі. Уся цяжкасьць загатовак клалася на бедняка і серадняка. Кулакі актыўна падтрымлівалі вызначаны плян загатовак і з воплескамі прымалі рэзалюцыю аб неабходнасьці здачы хлеба.

Абураная бедната выступіла супроць кулацкіх падпявал, яна зьвярнулася да прадстаўніка з раёну з заявай аб няправільнай дзейнасьці галоўкі сельсавета і патрабавала перагледзець плян і перанесьці ўсю цяжкасьць загатовак на кулацкія гаспадаркі.

Пры паўторным пераглядзе пляна ў прысутнасьці беднаты, цяжкасьць загатовак перакладзена на кулацкія гаспадаркі. На сходзе сябры і старшыня Кавалёў таксама актыўна абаранялі кулака, яны выкрыквалі:—«Не дазволім пераабкладваць! Досыць з кулака накладзенай намі нормы!“ Ня гледзячы на ўсе довады беднаты, што кулакі недаабкладзены, галоўка на дыбы падымалася ў абарону. Меліся моманты і пагрозы па адрасу беднаты.

Бедныя ўрэшце замаўчалі, бо іх ініцыятыва і актыўнасьць была падаўлена.

Зараз памылка выпраўлена. Але факт скрыўленьня клясавай лініі з боку галоўкі сельсавету ў асобе старшыні с.-с. і сакратара парт'ячэйкі Кавалёва застаецца. Такому партыйцу ў шэрагах партыі месца няма.

Падарожны

Не аслабляць хлебазагатовак.

У кастрычніку па БССР да 25-га загатоўлена розных хлебапрадуктаў 29844 тоны, што складае 119,4 проц. месячнага пляну. За ўвесь-жа час з пачатку кампаніі да 25 кастрычніка па БССР загатоўлена 42.112 тон ці 73,3 проц. гадавога пляну.

Трэба адзначыць, што за апошнюю пяцідзёнку загатоўлена звыш 10.000 тон супроць 7.330 тон у папярэднія пяць дзён. Слаба праходзяць загатоўкі ў Бабруйшчыне, якая да 25 кастрычніка выканала 61,5 проц. свайго месячнага пляну, яшчэ горш у Мазыршчыне, дзе за гэты-ж тэрмін выканана ня больш 60 проц. месячнага пляну.

Як мы бачым, тэмп загатовак хлебо ўзмацніўся і досыць значна. Гэта з усёй вострасьцю ставіць перад загатоўчымі организацыямі задачу ўправіцца з прыёмкай, хаваньнем і перакідкай хлеба. Між тым, трэба сказаць, што ў гэтых адносінах нашы загатоўчыя арганізацыі яшчэ далёка ня ўсё зрабілі і не паказваюць належнай ініцыятывы. Мала яшчэ зроблена ў сэнсе адшуканьня на мясцох складачных памяшканьняў для прыёмкі хлеба Слаба праводзіцца праца па грамадзкай мабілізацыі рахункавых працаўнікоў і прыёмшчыкаў хлеба. У РСФСР практыкуецца ў час прыезду чырвоных абозаў з хлебам перакідка працаўнікоў з іншых устаноў, якія дапамагаюць выпісваць квіткі, узважваць хлеб, каб хутчэй адпусьціць прыехаўшых з хлебам сялян. У нас жа ў гэтай галіне нічога ня робіцца. Вінават тут ЦП саюзу саўгандальслужачых, які не дадумаўся паставіць гэта пытаньне перад сваімі прафсаюзнымі масамі.

Не зважаючы на больш-менш узмоцнены тэмп загатовак, усё-ж прыходзіцца канстатаваць, што кулацкія і заможныя гаспадаркі слаба яшчэ ахоплены нашымі загатоўчымі плянамі, і хлебныя лішкі ў гэтых гаспадарках далёка яшчэ ня выяўлены.

Дасягнутыя па некаторых акругах посьпехі ў галіне хлебазагатовак ні ў якім разе не павінны супакойваць мясцовых працаўнікоў. Тэмп хлебазагатовак ні ў якім разе не павінен паслабляцца.

Выканалі 130 проц. заданьня.

Сяляне Абчугскага сельсавету заданьне па загатоўцы бульбы выканалі на 130 проц. Выкананьне прайшло сваечасова, па сельсавету не засталося амаль што ніводнага серадняка, які-б ня даў хоць сколькі небудзь бульбы. А гэта гаворыць за тое, што серадняцкія гаспадаркі на баку бяднякоў, якія ёсьць аснова і апора савецкай улады і камуністычнай партыі.

Кулаку прапанавалі здаць бульбу ў плянавым парадку, а серадняк і бядняк па свайму жаданьню здавалі. Такім чынам у Абчугскім сельсавеце накіравана на ст. Слаўнас 5846 пудоў бульбы. Па разьмеркаваньні на сельсаветы патрабавалася 4.000 пудоў.

Адамчук.

Мопраўцы да загатовак хлеба і бульбы.

Згодна пастановы агульна-гарадзкой нарады МОПР-актыву, мопраўцамі праводзіўся на працягу 4 дзён 28—31 кастрычніка збор мяшкоў па г. Менску для арганізуючыхся чырвоных эшалёнаў бульбы маскоўскім і ленінградзкім рабочым. Кампанія гэта скончылася 1 лістапада.

Збор мяшкоў праводзіўся сярод членаў МОПР па ячэйках сіламі МОПР актыву.

На прадпрыёмствах, установах, цэхах і г. д. праводзіліся экстраныя сходы ў часе перапынку з маленькай інфармацыяй аб 4-дзёньніку па збору мяшкоў.

Пачаўся збор мяшкоў.

(Менская акруга).

Паводле вестак Акргандлю, па Менскай акрузе ўжо пачаўся збор мяшкоў. Так, у Смалявічах сабрана—400 мяшкоў, Пухавічах—200, Сьмілавічах—300 і г. д.

Збор мяшкоў па гораду.

Згодна пастановы Акргандлю, у Менску ў хуткім часе будзе арганізаваны збор мяшкоў па кватэрах. Для правядзеньня збору прыцягваюцца камсамольскія арганізацыі.

Рабочыя брыгады ў дапамогу збору мяшкоў.

ЦСПСБ вылучыў рабочыя брыгады ад 8 прафсаюзаў, у колькасьці 50 чалавек для дапамогі збору мяшкоў па фабрыках, заводах, установах і рабочых кватэрах г. Менску.

С. Алыпаў

Апартуністычная рэвізія ленінізму ў сялянскім пытаньні.

Даволі вядомы ўжо канкрэтныя прапановы правых, якія спрабавалі „выправіць“ вясковую палітыку партыі вызваленьнем кулака ад індывідуальнага абкладаньня, кулацкай палітыкай цэн і г. д. Але ў правых ёсьць спробы і тэарэтычнага абгрунтаваньня сваіх апартуністычных прапаноў і выказваньняў.

Найбольш адважным крокам у гэтым напрамку зьяўляецца спроба т. Бухарына ў корані **перагледзець вучэньне Леніна аб рабоча-сялянскім саюзе ва ўмовах сацыялістычнага будаўніцтва.**

У гэтым ня цяжка пераканацца, уцікнуўшы ў тое, што гаворыць т. Бухарын, і параўнаўшы гэта з уласнымі поглядамі Уладзіміра Ільліча па гэтаму пытаньню.

„Галоўная сутнасьць яе (дыктатуры пралетарыяту—А.) у арганізаванасьці і дысцыплінаванасьці перадавога атраду працоўных, яго авангарду, яго адзінага кіраўніка—пралетарыяту. Яго мэта—утварыць сацыялізм, зьнішчыць падзел грамады на клясы, зрабіць усіх членаў грамады працоўнымі, зьнішчыць эксплёатацыю чалавека чалавекам“. (Ленін, т. XVI, стар. 226, выд. 1924 г.).

Вось асноўная задача пралетарскай дыктатуры. І ёй, гэтай дыктатуры, патрэбен саюз з сялянствам для таго, каб „пралетарыят мог утрымаць кіраўнічую ролю і дзяржаўную ўладу“ (т. XVIII, ч. 1-я стар 331). Але калі так, дык гутарка ідзе, як відаць, аб саюзе пралетарыяту ня з усім сялянствам, а толькі з пэўнай часткай яго.

З геніяльнай прастатой і яснасьцю сутнасьць сялянскай палітыкі пралетарыяту выяўлена ў вядомай формуле Леніна: „умець дасягаць згоды з сярэднім сялянствам, ні на хвіліну не адмаўляючыся ад барацьбы з кулаком і моцна абапіраючыся толькі на беднату“. Больш ясна ня скажаш.

А тым ня менш т. Бухарын запэўняе нас у зусім процілеглым.

У сваім дакладзе ў дзень пяцігадовай гадавіны сьмерці Леніна т. Бухарын гаворыць: **„Галоўнай гарантыяй сацыялістычнага будаўніцтва ў нас ёсьць клопат аб найбольш спрыяючым злучэньні клясавых сіл, якое забясьпечыла-б магчымасьць далейшага будаўніцтва сацыялізму... клопат аб злучэньні «пралетарскай рэволюцыі» з „сялянскай вайной“ у новай форме, на гэты раз «будаўнічай» форме.**

Гэта—**галоўнае.** Гэта тое, на што зазначаў Маркс, што наперакор ласальянскім традыцыям, наперакор усялякім каўтскаіанцам, меншавікам і інш. зьяўляецца працягам **„марксысцкіх поглядаў“** (Н. І. Бухарын. Палітычны тэстамант Леніна, стар. 21. Падкрэслена аўтарам).

І гэта не выпадковая думка, а адно з асноўных палажэньняў дакладу, якое паўтараецца не адзін раз (гл. напрыклад, стар. 8). Што-ж яно азначае, і якія з яго трэба зрабіць вывады?

Тав. Бухарын спасылаецца на ліст К. Маркса да Фр. Энгельса ад 16 жніўня 1856 г. У гэтым лісьце Маркс гаворыць: „Уся справа ў Нямеччыне будзе залежаць ад магчымасьці падтрымаць пралетарскую рэвалюцыю якім небудзь другім выданьнем сялянскай вайны. Тады справа пойдзе добра“.

Вядома, што пад імем сялянскай вайны ў гісторыю ўвайшло грандыёзнае паўстаньне нямецкага сялянства ў першай палове XVI веку.

Тагочасная Нямеччына была фэадальна-прыгоньніцкай дзяржавай.

„Сялянская вайна“ ачышчала шляхі для вольнага разьвіцьця прыватнаўласьніцкай гаспадаркі, г. зн. для разьвіцьця капіталізму. Гэта была дэмакратычная сялянская рэвалюцыя. „Буржуазна-дэмакратычны зьмест рэвалюцыі—гэта значыць ачыстка сацыяльных адносін (парадкаў, устаноў) краіны ад сярэднявякоўя, ад прыгоньніцтва, ад фэадалізму“ (Ленін. т. XVIII, ч. 1, стар. 364). Аб сацыялізме тут і не спамінаецца: вось у чым быў сэнс „сялянскай вайны“ ў Нямеччыне XVI веку.

Аб другім выданьні „сялянскай вайны“ Маркс пісаў у сярэдзіне XIX в. Да гэтага часу Нямечына ўжо ня была фэадальна-прыгоньніцкай дзяржавай. Прамысловы капіталізм шпарка пасоўваўся да свайго панаваньня і востра зьмяняў **х а р а к т а р** клясавай структуры грамады. Разам з шалёным **р о с т а м** прамысловага капіталізму разьвівалася і рабочая кляса.

Таму Маркс і пісаў аб магчымасьці падтрымаць пралетарскую рэвалюцыю „сялянскай вайной“. Але гэтае падтрыманьне пралетарскай рэвалюцыі з боку ўсяго сялянства магло быць толькі вельмі кароткатэрміновым і толькі ў такой меры, у якой пралетарыят дарабляў буржуазную рэвалюцыю. Сялянства ў цэлым падтрымала-б у гэтым выпадку пралетарыят зусім не таму, што ён робіць сацыялістычную рэвалюцыю, а таму, што ён назаўсёды зьнішчае розныя рэшткі прыгоньніцтва.

Такім чынам, „сялянская вайна“ сама па сабе, нават калі яна вядзецца пад кіраўніцтвам пралетарыяту, ня вырашае задач сацыялістычнага характару. Вырашэньне сацыялістычных задач на вёсцы пралетарыят можа распачаць толькі тады, калі яму ўдасца расколоць вёску. Але ў такім выпадку «сялянская вайна» ператварыцца ў вайну ўнутры самога сялянства: кіруемая пралетарыятам бедната змагаецца ўжо супроць капіталістычных элемэнтаў вёскі.

Гэта дасканала даказана і вопытам вялікай расейскай рэвалюцыі. У Расеі аж да Кастрычніка 1917 г. меліся буйныя рэшткі прыгоньніцтва, якія выяўляліся перш усяго ў вялізарнай зямельнай уласнасьці абшарнікаў. Такім чынам, наша Кастрычнікавая рэвалюцыя павінна была адначасова вырашаць задачы і дэмакратычнай рэвалюцыі: пакончыць з абшарніцкім землеўладаньнем і з прыгоньніцкімі перажыткамі наогул.

„Буржуазная рэвалюцыя была намі даведзена да канца. Сялянства ішло за намі ў цэлым“ (т. XV, стар. 474). Кажучы мовою Маркса, мы былі ў гэтым выпадку падтрыманы „сялянскай вайной“.

Пасьля вырашэньня дэмакратычных задач, мы перайшлі на вёсцы да вырашэньня задач сацыялістычных, **але ўжо пры іншых суадносінах клясавых сіл.**

Пры падтрыманьні „сялянскай вайны“ (г. зн. усяго сялянства) Кастрычнікавая рэвалюцыя вырашыла задачы буржуазна-дэмакратычнага характару. Абапіраючыся на **беднату** і ў суровай барацьбе **з кулацтвам,** яна распачала на вёсцы вырашэньне задач **сацыялістычнага характару.**

„Каб вырашыць другую, найбольш цяжкую частку задачы (г. зн. каб пабудаваць сацыялізм—А.), пралетарыят, перамогшы буржуазію, павінен няўхільна весьці наступную асноўную лінію сваёй палітыкі ў адносіне да сялянства: пралетарыят павінен падзяляць, разьмяжоўваць селяніна-працоўнага ад селяніна-ўласьніка, селяніна-работніка, ад селяніна-гандляра, селяніна-працаўніка ад селяніна-спэкулянта. У гэтым разьмежаваньні ўся сутнасьць сацыялізму“ (т. XVI, стар. 352).

Як-жа пасьля гэтага расцэньваць бухарынскае палажэньне аб злучэньні сацыялістычнага будаўніцтва з „сялянскай вайной“? У пераводзе на звычайную мову гэта азначае ня больш і ня менш, як абарону саюзу будуючага сацыялізм пралетарыяту з усім сялянствам. І гэтае страшэннае скажэньне ленінізму прыкрываецца імям Маркса і Леніна.

Абарона саюзу рабочае клясы з усім сялянствам у эпоху сацыялістычнага будаўніцтва ў выніку вядзе **да адмаўленьня сацыялістычнага характару нашае рэвалюцыі:** бо гэты саюз магчымы толькі ва ўмовах вырашэньня задач дэмакратычнай рэвалюцыі.

Пропаведзь саюзу з усім сялянствам, ва ўмовах будаўніцтва сацыялізму не абмяжоўваецца толькі сялянскім пытаньнем. Яна ідзе куды далей—яна закранае асноўнае пытаньне ленінізму, яго вучэньне аб дыктатуры пралетарыяту. Гэта—абарона клясавага супрацоўніцтва і клясавага міру пры дыктатуры пралетарыяту ў процілегласьць ленінскаму вучэньню аб клясавай барацьбе пры дыктатуры пралетарыяту.

Клясавая барацьба будзе існаваць аж да таго часу, пакуль ня будуць зьнішчаны клясы, г. зн. на працягу ўсяго пераходнага пэрыяду. А як малююць правыя, у іх і ў пераходны пэрыяд адбываецца мірны і плаўны рост сацыялізму, у які мірна ўрастаюць кулакі і канцэсыянэры.

Філёзофія правых на практыцы павяла-б да шпаркага ўзмацненьня капіталістычных элемэнтаў у краіне і тым самым штурхала-б рэвалюцыю да пагібелі.

І сапраўды, калі патрэбен саюз з усім сялянствам, дык ці ёсьць сэнс наступаць на свайго „саюзьніка“-кулака? А адгэтуль проста выцякаюць прапановы адмяніць індывідуальнае абкладаньне кулацтва, праводзіць палітыку цэн на хлеб у адпаведнасьці з інтарэсамі кулака, адным словам—не перашкаджаць кулацкай вытворчасьці.

У поўнай адпаведнасьці з агульнай лініяй правых знаходзяцца іх адносіны да калгаснага і саўгаснага будаўніцтва. Тав. Бухарын гаворыць, што калгасы не зьяўляюцца асноўным шляхам для сацыялістычнай перабудовы бядняцка-серадняцкай гаспадаркі. З другога боку, мы, па думцы правых, не павінны перашкаджаць кулацкай вытворчасьці. А калгасы і саўгасы яму якраз і перашкаджаюць. Адгэтуль і крыкі правых аб тым, што мы зрабілі перагіб у гэтай галіне, што не патрэбна так сьпяшацца і г. д.

Не разумеючы ролі калгасаў і саўгасаў, не разумеючы новых задач, якія паўсталі перад намі на вёсцы, правыя апартуністычна падыходзяць да пытаньня аб беднаце. Яны «...спрабуюць замазаць ролю і значэньне самастойнае арганізацыі шырокіх мас беднаты. Спробы замазваньня ці абмінаньня гэтай важнейшай задачы партыі на справе накіраваны ня толькі супроць бедняка, але і супроць серадняка, паскольку арганізацыя бядняцкага сялянства мае сваёй мэтай узмацніць апору савецкай улады на вёсцы, узмацніць адпор кулаку, умацаваць на грунце гэтага адпору саюз бедняка і серадняка-селяніна. Партыя рашуча адхіляе гэтыя спробы цягнуць партыю ў апартуністычнае балота палітыкі адмовы ад умацаваньня апоры партыі на вёсцы, палітыкі развязваньня кулака ў яго барацьбе з беднатой» (рэзалюцыя XVI партканфэрэнцыі па дакладу т. Калініна).

Як у тэорыі, так і ў практычных прапановах сваіх, правыя выступаюць у ролі сапраўдных рэфармістаў. Прыняцьце іх палітыкі павяло-б да няминучай пагібелі пралетарскай дыктатуры. Вось чаму ленінская партыя так рашуча змагаецца і будзе змагацца, як з правым ухілам, так і з прымірэнцтвам у адносіне да яго.

Рашучы адпор нацыянал-дэмакратызму і шавінізму ўсіх колераў.

Яшчэ больш згуртуем шэрагі Ленінскай партыі, яшчэ больш цьвёрда і рашуча ўзмацнім барацьбу з усялякімі ўхіламі ад Ленінскай лініі.

Нацыянал-дэмакратаў—выключыць з партыі.

Рэзалюцыя партячэйкі НКА.

1. Агульны сход ячэйкі НКА цалкам і поўнасьцю салідарызуецца з перадавой Ц. О. КП(б)Б «Зьвязда», дзе даецца ацэнка выступленьню групы Ільлючонка, Марука, Ів. Цьвікевіча і М. Гарэцкага, якое па сутнасьці зьяўляецца новай нацыянал-дэмакратычнай вылазкай.

Агульны сход ячэйкі НКА лічыць, што памянёная група абараняла контррэвалюцыйную нацыянал-дэмакратычную лінію, што гэта група сваім выступленьнем стала на чале нацыянал-дэмакратычнай атакі на нашу партыю і яе Ленінскі ЦК, і што паміж гэтай групай «партыйцаў» і нацыянал-дэмакратамі сьцёрліся фактычна ўсе межы. Група Ільлючонка, Марука і Цьвікевіча карысталася зброяй, якая ўзята з арсэналу польскага фашызму і беларускага нацыянал-дэмакратызму Заходняй Беларусі.

2. Ячэйка НКА далучаецца да патрабаваньня ячэйкі Камвузу аб выключэньні гэтай групы з партыі і адабрае пастанову ячэйкі БДВ аб выключэньні з партыі І. Цьвікевіча,

3. Ячэйка НКА вітае газэту „Зьвязда“, якая па-бальшавіцку і рашуча выкрывае ўсе праявы нацыянал-дэмакратызму.

4. Яшчэ больш загастрыць увагу перад кожным партыйцам ячэйкі на неабходнасьць рашучай і няпрымірымай барацьбы з усімі ўхіламі ад Ленінскай лініі партыі, узмацніць барацьбу з усімі праявамі нацыяналізму і шавінізму і асабліва з найбольш небясьпечным на даным этапе беларускім нацыянал-дэмакратызмам.

ФЭЛЬЕТОН.

БУДЗЕМ МОЦНА БІЦЬ.

«Прыхільнікаў» нацыянальнай палітыкі партыі і ўлады ў нас хапае. Дасі па носе аднаму, глядзіш падымае яго другі. Ня толькі падымае, але яшчэ лінію партыі спрабуе „выправіць“... Дасі па руках гэтаму, дык з куточку чуецца голас трэцяга...

Актывізацыя беларускага нацыянал-дэмакратызму спаткала самы рашучы адпор з боку партыі, з боку рабочых мас і ўсёй савецкай грамадзкасьці. Роля нацыянал-дэмакратыі, спрабуючай устаўляць палкі ў калёсы нашага сацыялістычнага будаўніцтва, выкрыта ва ўсёй яе няпрыгляднасьці. Атрымалі, даражэнькія, па руках так, што ня хутка ачухаюцца.

Ага, беларускіх шавіністаў б'юць, значыцца чакай зьмены ў лініі, разважаюць расейскія шавіністы і пачынаюць там-сям падымаць нос. Каб толькі падымалі, а то яшчэ імкнуцца павесьці наступ на лінію партыі ў нацыянальным пытаньні.

Мы добра ведаем, як па ўстановах, часам, «шчыра» праводзіцца беларусізацыя апарату. Пісалася аб гэтым ужо ня раз. У гэтым фэльетоне мы думаем спыніцца на праявах расейскага шавінізму ў некаторых беларускіх навучальных установах.

З кастрычніка ў Менску адчыніўся беларускі дашкольны тэхнікум.

Кажаце, беларускі? Нішто, раз-два і мы яго расейскім зробім, відаць, разважаў выкладчык тэхнікуму Гурскі, седзячы з прыяцелямі за традыцыйнай шклянкай чаю.

Як і дзе разважаў паважаны пэдагог, мы добра ня ведаем, ды гэта нас мала і цікавіць. Нас больш цікавіць аўдыторыя, дзе Гурскі ажыцьцяўляў свае вялікадзяржаўныя імкненьні.

Жадаеце малюнак з натуры? Калі ласка...

У дашкольным тэхнікуме лекцыя фізыкі ці матэматыкі,—гэта ня столь важна. Пэдагог Гурскі вядзе тлумачэньне на расейскай мове. Бачыць, што студэнты чагосьці пераглядваюцца.

Ага! Нужно выяснить вопрос, есть ли наши приверженцы,—мільганула думка ў галаве пэдагога.

— Товарищи студенты, давайте обсудим вопрос—на каком языке вести преподавание моих предметов.

— На беларускай, на расейскай,—панеслася з усіх куткоў аўдыторыі. Гармідар падняўся такі, што ня лекцыя, а проста любата.

Выхад з утварыўшагася становішча быў хутка знойдзен пэдагогам—на тое ён і выхавацель, каб хутка арыентавацца ў любым заблытаным пытаньні.

— Товарищи, зачем шуметь, давайте разрешим вопрос голосованием, —уносіць прапанову пэдагог.

Прапанова прымаецца.

— Кто за то, чтоб преподавание вести на русском языке?

У выніку такой падрыхтоўчай працы і „умелой“ пастаноўкі пытаньня, большасьцю галасоў было вырашана весьці выкладаньне на расейскай мове.

Лінію партыі пэдагог Гурскі „выправіў“, але не на доўга. Лінія Гурскага ў тэхнікуме ўжо ліквідавана. Мы думаем, што гэты пэдагог будзе неадкладна „выправлен“ з тэхнікуму і наогул ад працы ў навучальных установах раз і на заўсёгды, інакш яно і быць ня можа.

Прыхільнікі палітыкі Гурскага аказваецца ёсьць і на пэдалёгічным аддзяленьні пэдфаку БДУ. Толькі тут яны знайшліся не сярод лектароў, а сярод студэнтаў.

Гэтымі днямі на лекцыі прафэсара Разанава група слухачоў патрабавала, каб прафэсар чытаў лекцыі на расейскай мове і больш таго, дамагалася паставіць пытаньне на галасаваньне.

Вылазка расейскіх шавіністаў не ўдалася, і прафэсар катэгарычна адмовіўся і ад першай і ад другой прапановы. Але гэтага мала, ініцыятары павінны быць выцягнуты за вушка, ды на сонейка.

„Я органически не перевариваю белорусского языка, не изучал и не буду изучать его“,—гаворыць галоўны інжынэр папертрэсту Бурберг.

Гэтая заява на наш погляд асаблівага тлумачэньня і не патрабуе.

Мы добра ведаем, што ёсьць у нас элемэнты, якія не пераварваюць дыктатуры пралетарыяту і свае «інтэрнацыянальныя» выступленьні накіроўваюць супроць нацыянальнай палітыкі камуністычнай партыі.

Ведаем і вядзем з гэтымі «інтэрнацыяналістамі» рашучую барацьбу. Мы білі, б'ём і будзем жорстка біць па руках усіх тых, хто імкнецца скажаць лінію партыі ў нацыянальным пытаньні.

В. Зайцаў.

ПАД КІРАЎНІЦТВАМ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ РАШУЧА БУДЗЕМ ЗМАГАЦЦА З КЛЯСАВЫМ ВОРАГАМ.

(Рэзалюцыя агульнага сходу калектыву Б. Д. Музтэхнікума).

Агульны сход настаўнікаў, студэнтаў і тэхнічных працаўнікоў Беларускага Дзяржаўнага Музычнага Тэхнікуму ў ліку 350 асоб, заслухаўшы даклад аб вылазцы нацыянал-дэмакратаў на сходзе на праверцы ячэйкі Наркамасьветы канстатуе, што ў сучасны момант, момант рашучага наступу сацыялістычных элемэнтаў на капіталістычныя і выцясьненьня апошніх з усіх галін будаўніцтва і культуры, клясавы вораг асабліва вядзе барацьбу з сацыялістычным наступам і імкнецца скарыстоўваць усякія формы і магчымасьці для барацьбы.

Вырашанае Кастрычнікавай рэвалюцыяй нацыянальна-культурнае пытаньне пад лёзунгам: „нацыянальная па форме, пралетарская па зьместу“. Нацыянал-дэмакраты супроцьстаўляюць свой лёзунг—нацыянальная па форме і зьместу, абараняючы гэты лёзунг, яны далучаюцца да нацыянал-фашызму Пілсудзкага, Луцкевіча і К-а, да сучаснай палітыкі фашысцкага польскага ўраду. Наша задача—рашуча і бязьлітасна накіраваць свой агонь на ўсе віды нацыянал-дэмакратызму, шавінізму, асабліва беларускага, як больш небясьпечнага ў сучасны момант, ва ўмовах Беларусі, не паслабляючы барацьбы з вялікадзяржаўным, яўрэйскім і польскім шавінізмам і антысэмітызмам.

Ніякай уступкі кулаку, нэпману і буржуазнаму інтэлігенту.

За ўзмоцненыя і паскораныя тэмпы ў разьвіцьці сацыялістычнага будаўніцтва і культуры на чале якой стаіць КП(б)Б.

Мы музтэхнікумаўцы рашуча пратэстуем супроць вылазкі нацыянал-шавіністаў на сходзе ячэйкі Наркамасьветы, як супроць прыніжэньня палітычнага значэньня чысткі партыі, супроць скарыстаньня яе клясавым ворагам для сваёй барацьбы. Мы, мастакі, па ўсіх галінах мастацтва заяўляем камуністычную партыю, што з ёй і пад яе кіраўніцтвам будзем будаваць сацыялізм і нацыянальную культуру з пралетарскім зьместам, а таксама дапаможам партыі змагацца за чыстату ленінскай лініі ва ўсіх галінах будаўніцтва.

Няхай жыве змагар на культурным фронце КП(б)Б.

Узмацніць тэмп падрыхтоўкі да вясеньняй сяўбы.

ГАТУНКОВЫ АВЁС ПАЧАЎ ЗАВОЗІЦЦА. ПРА НАСЕНЬНЕ КАНЮШЫНЫ НІЧОГА НЯ ЧУВАЦЬ. ПАЛЯВОДСАЮЗ НЯ ВЕДАЕ КОЛЬКІ І КУДЫ ТРЭБА ЗАВЕЗЬЦІ НАСЕННАЙ БУЛЬБЫ.

Усю савецкую грамадзкасьць цікавіць як рыхтуюцца нашы цэнтральныя арганізацыі да вясеньняй пасеўнай кампаніі. Заходзім у Белсельсаюз. Вы запытаеце, як у Белсельсаюзе—ён-жа рэарганізаван у паляводны і садова-агародні саюзы?

Так, вы, таварышы, ня мыляецеся. Памыліліся толькі працаўнікі Белсельсаюзу, якія не пасьпелі да зьезду ўпаўнаважаных падрыхтаваць адпаведныя статуты і дэ-факто існуюць паляводсаюз і садова-гародні саюз, а дэюрэ... Белсельсаюз. Калі памятаеце, усебеларускі зьезд упаўнаважаных сельска-гаспадарчай каапэрацыі адбываўся ў першай палове кастрычніка. Зьезд прыняў пастанову аб рэформе Белсельсаюзу ў паказаныя вышэй саюзы. Трэба было зацьвердзіць статуты апошніх, хапіліся, але яны не падрыхтаваны, ну і працуюць бяз статуту.

І так, заходзім у Паляводсаюз, выбачайце, Белсельсаюз. Нас інфармуюць, што ў БССР мяркуецца завезьці 800 тысяч пуд. гатунковага насеньня аўсу, які часткова ўжо пачаў паступаць.

Гатунковым аўсом у парадку абмену на мясцовы ў першую чаргу будуць поўнасьцю забясьпечаны калгасы і сельскія камітэты таварыстваў сялянскай узаемадапамогі. Рэшта-ж насеньня аўсу праз сельска-гаспадарчыя крэдытныя таварыствы будзе накіравана для задавальненьня бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Горш стаіць справа з забесьпячэньнем вясеньняй пасеўнай кампаніі насеньнем канюшыны. Пытаньне з канюшынай яшчэ вісіць у паветры. Справа ў тым, што Наркамзем РСФСР яшчэ ня ведае, колькі ён зможа вылучыць насеньня канюшыны для патрэб Савецкай Беларусі. „Семенноводсаюз“ (Масква), які звычайна забясьпечваў БССР завозным насеньнем, адказвае, што без дазволу Наркамзему РСФСР ён для нас нічога ня можа адпусьціць.

Вы запытаеце, а як-жа справа з мясцовымі загатоўкамі канюшыны?

Ды пакуль што ніяк, бо адказны працаўнік Паляводсаюзу запэўняе: папершае—па яго словах насеньня канюшыны ў БССР мала; падругое...

Падругое—ўмалот канюшыны сяляне будуць рабіць толькі ўзімку і часткова вясной.

Так кажуць у Паляводсаюзе, а той, хто зьвязан з сельскай гаспадаркай, катэгарычна запэўняе, што ва ўмовах БССР умалот насеннай канюшыны з прадвеку праводзіцца сялянамі ўвосень і яшчэ дадае, што так робяць усе добрыя гаспадаркі.

У выніках такога яскравага разнагалосься адчуваецца недаацэнка ў пытаньні мясцовых загатовак насеньня канюшыны і калі гэта кампанія разгорнецца, думаем, дасканала ня скажа і сам Паляводсаюз. Між тым практыка мінулых гадоў гаворыць аб тым, што пэўная колькасьць насеньня канюшыны загатаўлялася і ў межах БССР. Цікава адзначыць, нас запэўнялі, што Паляводсаюз мае свой плян загатовак рознага насеньня, але, колькі яны мяркуюць загатовіць насеньня канюшыны, мы так адказу і не атрымалі.

Што чуваць з загатоўкай насеньня лёну?

Летась насеньня лёну-даўгунца было завезена каля 100.000 пуд., з іх 60.000 пуд. было адпушчана Полаччыне, але гэта насеньне, па словах Паляводсаюзу, «сябе не апраўдала», г. з. ня прыгодна для ўмоў БССР. А як-жа таварышы, не праверыўшы, завозілі такую колькасьць насеньня? У сучасны момант Наркамзем, Наркамгандлю і Паляводсаюз забраніравалі ўсё насеньне-лёну, якое будзе загатоўлена ў Лёзьнянскім і Суражскім раёнах Віцебшчыны для задавальненьня Полаччыны і іншых акруг. Па вестках Паляводсаюзу гэтага насеньня загатоўлена ўжо 3500 тон.

Блытаецца Паляводсаюз і з загатоўкамі насеньня бульбы. Пасьля загатоўкі бульбы для спажывецкіх мэт, Паляводсаюз мяркуе разгарнуць загатоўкі бульбы да вясеньняй пасеўнай кампаніі. Правільней кажучы, забраніраваць пэўную колькасьць бульбы на насеньне. А вось сколькі браніраваць —Паляводсаюз яшчэ ня ведае. У Паляводсаюзе ня ведаюць—куды і колькі бульбы прыйдзецца завозіць, бо, кажуць, яшчэ няма заявак з акруг.

Акругі мы запрасілі, але яны не адказваюць, апраўдваецца Паляводсаюз. Нам-жа здаецца, што Паляводсаюз павінен быў мець і такія-сякія свае меркаваньні.

Магчыма ва ўсім вінавата рэформа Белсельсаюзу і Паляводсаюз не пасьпеў яшчэ перабудаваць сваю працу, але гэта ўсё-ж не апраўданьне. Мы лічым, што тэмп працы Паляводсаюзу ў падрыхтоўцы да сяўбы занадта павольны.

В. Паўночны.

Выкрыем хібы ў масавай палітасьветнай працы.

У МЕНСКУ ЛІТОЎСКІ КЛЮБ ЗЬМЯШЧАЕЦЦА Ў ПРАХАДНЫМ ПАКОІ ДОМУ КАМАСЬВЕТЫ.—ВІЦЕБСК ДАЎ ПРЫТУЛАК ЛІТОЎСКАМУ КЛЮБУ Ў СКЛЕПЕ.—ЛОШЫЦКІ НАРДОМ—ПРЫПЫНАК ДЛЯ ХУЛІГАНАЎ І КУЛАКОЎ.—УЗЬДЗЕНСКІ НАРДОМ ЗАЙМАЕЦЦА ТОЛЬКІ ЮБІЛЕЙНАЙ ТЭАТРАЛЬШЧЫНАЙ.—КЛЮБ САВЕЦКІХ І ГАНДЛЁВЫХ СЛУЖАЧЫХ У МЕНСКУ МАСАВАЙ-ПАЛІТАСЬВЕТНАЙ ПРАЦАЙ НЕ ЗАЙМАЎСЯ.

Працу нардому трэба ажывіць.

(М. Узда, Меншчына).

У м. Узда ёсьць нардом і пры ім хата-чытальня, бібліятэка і справачнае бюро. Але за апошні час ніякай працы нардом не вядзе. Нардом, апрача платных пастановак прыежджых артыстаў, ніякай масавай працай не займаецца. Праўда, пры нардоме ёсьць драмгурток беларускі і яўрэйскі, але і іх праца „юбілейная“, яны працуюць і робяць пастаноўкі толькі ў дні рэвалюцыйных сьвятаў. У іншы час нардом на замку.

Бібліятэка таксама не працуе. Каб атрымаць кнігу, трэба шукаць бібліятэкара па мястэчку і то не заўсёды яго знойдзеце. Бачыце, бібліятэкар—заняты чалавек. У яго шмат іншай працы (хоць гэта пасада ў нардоме і платная). Чытальня таксама заўсёды на замку. Газэты, што атрымлівае чытальня, зьбіраюцца і падшываюцца ў архіў. Бюро даведак пры нардоме зусім не працуе. У дні кірмашоў—нядзелю і сераду, калі сяляне ідуць туды за дапамогаю, яны знаходзяць нардом замкнёным. А каля нардому нават і абвестка ёсьць, што бюро даведак працуе ў гэтыя дні.

Камуністычная і камсамольская ячэйкі аб усім гэтым ведаюць і ўсё гэта бачаць, але яны лічаць, што праца Нардому—ня іх справа—„гэта справа загадчыка Нардому“.

Надышлі доўгія асеньнія вечары, насельніцтва жадае наведваць розныя гурткі і сходы, пачытаць газэту, атрымаць кнігу. Працу нардому трэба ажывіць.

Даон.

РАЗВАЛ У ЛОШЫЦКІМ НАРДОМЕ.

У вёсцы Лошыца (Прыгародны сельсавет) ёсьць нардом. Нардом знаходзіцца каля самага шляху і з надворнага і ўнутранага бакоў мала чым розьніцца ад хлява. Сьцены нардому, за выключэньнем двух-трох партрэтаў і некалькіх плякатаў, якія пакрыты пылам і павучыньнем, нічым ня ўбраны. У нардоме вы знойдзеце нешта падобнае да інвэнтару, частка якога з кожным днём ідзе ў архіў, а астатняя частка звалена ў кучу. Сьмецьця ў нардоме поўна. Ніхто ня памятае, каб тут калі-небудзь мылі падлогу.

Зайшоўшы ў хату-чытальню нардому, вы ўбачыце нешта кашмарнае. Па ўсіх сталох і нават на падлозе валяюцца газэты і кнігі. Частка газэт і кніг пакрыты тоўстым пластом пылу, так што да іх страшна і падыходзіць. Амаль што кожны вечар у нардоме бываюць людзі. Хуліганы і хуліганчыкі, кулакі і падкулачнікі і нават сумленныя людзі заглядваюць у нардом. Усе яны, за выключэньнем сумленных людзей, знаходзяць працу ў нардоме. Адны з іх сьвісьцяць на розныя галасы, другія лаюцца паскуднымі словамі і кідаюцца шапкамі, а людзям, якія жадаюць пачытаць газэты, кнігу, або што-небудзь карыснае атрымаць, нельга задаволіць свайго жаданьня.

Прачытаць газэту нельга і па тэй прычыне, што ўсе апошнія нумары газэт зьмешаны са ўсімі газэтамі 1928 і 29 г. г., і на адшуканьне газэты трэба аддаць найменш паўгадзіны.

Належнай біаліатэкі нардом зусім ня мае. Ёсьць, праўда, брашуры, якія ў большасьці зусім не адпавядаюць свайму прызначэньню.

Гурткоў і куткоў ніякіх няма. Праўда, паважаныя шэфы з Беларускага пэдтэхнікуму арганізавалі два гурткі прыблізна два месяцы таму назад, але і яны лічацца толькі на паперы. Неяк раз з самага пачатку прышлі кіраўнікі з шэфаў для кіраваньня гурткамі і на тым праца і скончылася.

Належнага кіраўніцтва нардомам з боку адпаведных арганізацый няма. Трэба мабыць РСІ пацікавіцца як найхутчэй працай нардому, бо інакш грамадзкасьць ня будзе мець ніякай карысьці ад існаваньня нардому, як ня мае яе і зараз.

Селянін.

Пра клюбы літоўцаў і латышоў.

Справа палітыка і культурна-асьветнага абслугоўваньня літоўцаў у нас распачата вельмі нядаўна. Пераломным у гэтым напрамку зьяўляецца 1927 г., калі па раскінутых у самых глухіх кутках Беларусі літоўскіх вёсках сталі адчыняцца нацыянальныя школы, арганізоўваецца іншыя культурна-асьветныя ўстановы, калі літоўская працоўная грамадзкасьць у гарадох пачала згуртоўвацца навокал сваіх клюбоў (Менск. Віцебск, Полацак), калі разгарнула сваю шырачэзную працу літоўская газэта „Raudonasis Artojas“.

Гэты невялічкі тэрмін разгорнутай Літбюро пры ЦК КПБ дзейнасьці сярод літоўскага насельніцтва даў шмат значных і плённых дасягненьняў. Палітычна і культурна адсталая літоўская вёска, якая знаходзілася пад моцным рэакцыйным уплывам ксяндзоў і кулацтва, у выніку праведзенае працы пачала абуджацца, энэргічна ўпітваць у сябе элемэнты савецкае грамадзкасьці, палітычна і культурна падцягнулася і зараз ужо прымае актыўны ўдзел у нашым сацыялістычным будаўніцтве.

Некалькі інакш справа абстаіць з літоўцамі ў гарадох. І трэба адкрыта сказаць, што на гэты сэктар працы ня зьвернута яшчэ належная ўвага. Прычынаю таму зьяўляецца не адсутнасьць дырэктыў, а тое, што гэтыя дырэктывы адпаведнымі органамі ня выконваюцца і не праводзяцца ў жыцьцё. Ёсьць наконт гэтага самыя нядаўнія (май, ліпень) і надзвычайна выразныя пастановы і бюро ЦК КПБ і нацкамісіі пры ЦВК БССР, якія кажуць аб неадменнай неабходнасьці прадастаўленьня пад клюбы дробных нацменшасьцяў (літоўцы, латышы) належных памяшканьняў і водпуску сродкаў на іх утрыманьне. Але гэтыя пастановы, з прычыны нядбайнасьці ніжэйшых выканаўчых органаў нашага дзяржаўнага апарату, застаюцца, на вялікі жаль, толькі пастановамі.

Вось як, напрыклад, справа абстаіць з „клюбамі“ гэтых нацменшасьцяў у гарадох. У Менску літоўскі „клюб“ зьмяшчаецца ў адным з прахадных пакояў Дому Камасьветы, побач з музэйным кутком „Каторга і ссылка“. Наведвальнікі „клюбу“ і наведвальнікі музэю, апынуўшыся тут, ня ведаюць, дзе яны знаходзяцца—ці то ў музэі, ці то ў клюбе. Латышскі „клюб“ зьмяшчаецца ў тым самым будынку, але каб трапіць у яго, трэба, напэўна, шукаць асобнага правадніка, бо ня знойдзеш уваходу. Яшчэ горш справа абстаіць у Віцебску, дзе клюб літоўцаў зьмяшчаецца ў былым склепе.

Зразумела, што ўжо гэтыя надворныя ўмовы клюбнае працы ня могуць спрыяць разгортваньню палітыка і культурна-асьветнай справы сярод літоўскага і латышскага насельніцтва ў гарадох, каб адцягнуць яго з-пад уплыву розных контррэвалюцыйных клерыкальных элемэнтаў, ксяндзоў, якія ў сваім распараджэньні маюць будынкі прасторных касьцёлаў і іншыя памяшканьні. Мы ведаем аб жыльлёвым крызісе ў гарадох, але, на нашу думку, пры жаданьні памяшканьні пад клюбы дробных нацменшасьцяў бязумоўна знайсьці можна. Трэба толькі аб гэтым паклапаціцца.

Са сродкамі для клюбаў справа абстаіць вельмі дрэнна. Гэта пытаньне ўпіраецца ў каменны бюракратызм некаторых нашых устаноў, якія напэўна, прытрымліваюцца прынцыпу: „просяць мала, трэба яшчэ менш даць“.

Нам вельмі важна пашыраць працу сярод працоўных нацменшасьцяў нашых гарадоў. Наладзіўшы гэту працу, нам праз актыў гарадзкіх рабочых і служачых лягчэй будзе рабіць пэўны ўплыў на вясковае насельніцтва нацменшасьцяў у напрамку перабудовы вёскі на новы лад і барацьбы з вясковаю цемраю, нацыянальнаю адмежаванасьцю і забабонамі.

В. Скардзіс.

Спадзяемся на новае праўленьне.

Адбыліся перавыбары праўленьня клюбу савецкіх і гандлёвых служачых. Рэвізійная камісія і шэраг выступаўшых прамоўцаў падкрэсьлівалі, што праўленьне клюбу не вяло палітычнай працы ў клюбе, што яно занялося выключна тэатральшчынай, забыўшыся, што гэта ня ёсьць яго асноўная праца. Выступаўшыя прамоўцы на цэлым шэрагу прыкладаў даказвалі, што палітыка-выхаваўчая праца не знайшла свайго адбітку ў працы клюбу.

Апрача таго, было адзначана, што ў клюбе адсутнічала фінансавая дысцыпліна, ня прытрымліваліся ўстаноўленых каштарысаў і была ў агульным парушана ўся праца. З 18 членаў праўленьня працавала ўсяго 4-5.

Клюб яшчэ не распачаў працы таму, што ў клюбе цяпер адбываецца рамонт... у той час, як рамонт неабходна і можна было зрабіць у чэрвені-ліпені.

Праўленьне клюбу абноўлена на 60 70 проц.

Можа новае праўленьне зьверне асаблівую ўвагу на палітыка-выхаваўчую працу, пераварыўшы клюб у сапраўды рабочы клюб, дзе адначасова з добрым канцэртам можна будзе разьвівацца і расьці палітычна.

Л.

І. Папоў.

Правы апартунізм у пытаньнях калгаснага будаўніцтва.

Бурны рост калгаснага руху за апошнія два гады зусім адхіляе тэорыю правых ухілістаў аб тым, што хоць „калгас гэта ёсьць магутная рэч, але ня шлях да сацыялізму“ (Бухарын).

Дзесяткі тысяч беднякоў, сераднякоў пераходзяць ад адзіна-асобных мэтадаў вядзеньня гаспадаркі да калектывізацыі. Аграмаджаньне працэсаў працы, прыладаў і сродкаў вытворчасьці ахапляюць усё большыя колы сялянства.

Усё гэта служыць яскравым пацьвярджэньнем правільнасьці генэральнае лініі партыі ў пытаньнях сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі і б'е правых апартуністаў, якія прапаведваюць разьвіцьцё вытворчых сіл вёскі наогул, у тым ліку і кулацкіх гаспадарак, бяз вучоту тых сацыяльна-клясавых і эканамічных працэсаў, якія адбываюцца зараз на вёсцы.

Аднак было-б вялікай недарэчнасьцю задаволіцца посьпехамі ў галіне калгаснага будаўніцтва і ня бачыць тых цяжкасьцяў і апартуністычных скажэньняў, якія стаяць на шляху сацыялістычнай перабудовы вёскі.

Капіталістычныя элемэнты вёскі ў асобе заможна-кулацкіх колаў сялянства і іх паслугачоў вядуць лютую барацьбу супроць калгаснага будаўніцтва.

У гэтай барацьбе кулак аб'ектыўна знаходзіць сабе памочнікаў у асобе ўсіх апартуністычных элемэнтаў, якія скажаюць генэральную і клясавую лінію ў пытаньнях калгаснага будаўніцтва, ажыцьцяўляюць правы апартунізм і тым самым жадаючы ці нежадаючы дапамагаюць кулаку.

Перш за ўсё правы апартунізм выяўляецца ў пытаньні аб клясавай барацьбе ў калгасах. У калгас ідуць сацыяльна неаднолькавыя элемэнты. У раёны поўнай калектывізацыі ў калгасы вельмі часта пранікае і кулак. Нават не ў раёнах поўнай калектывізацыі кулацкія элемэнты ідуць у калгасы з мэтаю разлажыць іх з сярэдзіны.

Калі мы наглядаем суровую клясавую барацьбу супроць калгасаў з боку капіталістычных элемэнтаў вёскі, дык побач з ёй вядзецца іншы раз суровая клясавая барацьба ўнутры калгасаў.

Дробна-ўласьніцкія традыцыі, якія складаліся вякамі, ня зьнікаюць канчаткова з калектыўным заворваньнем першае баразны ў найбольш простага выгляду калгасе. Прыватна-гаспадарчая зацікаўленасьць, зьвязаная з гэтымі традыцыямі, у той ці іншай ступені ня спыняе свайго панаваньня і над калгасьнікам, які распачаў сваю сацыялістычную перабудову з самых простых відаў аб'яднаньня.

Утварэньне непадзельных капіталаў, больш поўнае і разгорнутае аграмаджаньне працэсаў працы, прыладаў і сродкаў вытворчасьці прыводзяць да вострай клясавай барацьбы ўнутры калгасаў.

Кулацка-заможныя элемэнты, пранікшыя ў калгас з той ці іншай мэтай, каб пад маркай лжэ-калгасу самага прасьцейшага віду атрымаць ад дзяржавы на выгодных для сябе ўмовах машыны, крэдыт, усялякім чынам супраціўляюцца ўтварэньню непадзельных капіталаў і больш поўнаму аграмаджаньню.

Серадняцкая частка калгаснікаў іншы раз таксама змагаецца супроць поўнага аграмаджаньня, імкнучыся ў тым жа напрамку ўзьдзейнічаць на беднату.

Зацікаўленасьць бядняцка-батрацкай часткі калгасаў наадварот зводзіцца да найбольш шпаркага правядзеньня аграмаджаньня прыладаў і сродкаў вытворчасьці, і ўтварыць непадзельныя капіталы.

Ясна, што ва ўмовах прыватнаўласьніцкіх перажыткаў, якія пануюць над селянінам, уступіўшым у калгас, барацьба навакол непадзельных капіталаў і працэсаў аграмаджаньня мае характар клясавай барацьбы паміж асобнымі сацыяльнымі праслойкамі, бо клясавы падзел спачатку яшчэ ня зьнішчаецца.

Аднак знаходзяцца практыкі калгаснага будаўніцтва, якія, захапляючыся першымі перамогамі, сьпяшаць ня толькі адмовіцца ад клясавай барацьбы, але і падводзяць тэарэтычны фундамант пад пропаведзь поўнага клясавага міру ў калгасах.

Паслухаем, што піша адзін з такіх апартуністычных „практыкаў“ і „тэарэтыкаў“ калгаснага руху.

„Ніякага клясавага падзелу ўнутры калгасу рабіць нельга (піша нехта Н. Дзямідаў, працаваўшы па арганізацыі Цігінскага калгаснага камбінату), нават слоў—бедната, серадніякі, заможныя кулакі і г. д. ні разу не ўспамінаць (унутры калгасу), бо там няма сялян, а ёсьць добрыя і кепскія калгасьнікі.

...Гэта трэба зразумець, ці мы загубім калгасны рух. Калі Тарынін (гутарка ідзе аб кулаку) ня быў у калгасе, я лічыў яго буржуем, паўкулаком, цяпер ён у сто разоў больш верны, надзейны, чымся дзесяткі Лапаровых, Шіліновых і нават тых камуністаў, якія яшчэ не ў калгасе. Васілі Барынаў у параўнаньні горш Сурка Аляксандра, хоць першы быў раней актыўны бядняк і камбедавец, а другі манархіст“.

Мы падалі гэты доўгі выпіс з ліста Дзямідава сэкратару мясцовай партячэйкі з тым разьлікам, каб паказаць, наколькі апартуністычныя элемэнты сьляпыя, каб прапанаваць раўняцца не на камуністаў, ранейшых камбедаўцаў і беднату, а на ранейшых буржуяў, паўкулакоў, манархістаў.

Бядняк калгасьнік, сустракаючы ўпарты адпор у барацьбе за аграмаджаньне, за непадзельны капітал, за цьвёрдую лінію клясавай палітыкі ў калгасе, па тэорыі Дзямідава, не павінен называцца бедняком.

Бачыць толькі «кепскіх і добрых» калгасьнікаў, адхіляць клясавае разьмежаваньне ў калгасах, якое аб'ектыўна складаецца і выцякае з абставін і ўмоў арганізацыі калгасаў, значыць адхіляць клясавую барацьбу і ўмацоўваць пазіцыі заможнае часткі калгасьнікаў, больш таго—умацоўваць пазіцыі клясавага ворага.

Па Дзямідаву, клясавая барацьба **„павінна весьціся не на аснове ранейшага клясавага разьмежаваньня, а на аснове статуту і правіл унутранага распарадку калгасу“.**

Аднак, наперакор завярэньням Дзямідава, клясавае разьмежаваньне ўнутры калгасаў ёсьць і яшчэ будзе. Клясавая барацьба паміж сацыяльнымі групамі калгасьнікаў на аснове ранейшага клясавага разьмежаваньня і клясавага становішча таксама факт.

Дзямідаўскія пропаведзі клясавага міру—найбольш яскравае выяўленьне правага апартунізму ў калгаснай практыцы.

Наяўнасьць клясавага разьмежаваньня ў калгасах і клясавай барацьбы паміж асобнымі сацыяльна-клясавымі праслойкамі ва ўсю шырыню высоўвае пытаньне аб вырашчваньні кадраў калгаснага актыву.

Калгасны актыў павінен быць той ударнай сілай, абапіраючыся на якую партыя будзе цьвёрда і настойліва праводзіць палітыку сацыялістычнай перабудовы вёскі.

Клясавы падбор калгаснага актыву —першая ўмова яго надзейнасьці. Навакол вырашчваньня актыву няўхільна барацьба; заможны, а іншы раз і серадняк-калгасьнік будуць адсоўваць бедняка.

Але права-апартуністычным элемэнтам не да клясавага падбору актыву.

„Калгасны актыў,—навучае Дзямідаў,—**павінен падбірацца, як правіла, не па старых клясавых адзнаках, а як той ці іншы калгасьнік клапоціцца аб агульнай гаспадарцы“.**

Правыя апартуністы па-свойму паступовы. Саюз з усім сялянствам, «мірнае ўрастаньне кулака ў сацыялізм», а ня клясавая барацьба, ніякага клясавага разьмежаваньня ў калгасах, ніякай клясавай барацьбы, калгасны актыў павінен падбірацца не па клясавых адзнаках.

Карацей кажучы, Дзямідаў і падобныя яму прапануюць перадаць кіраўніцтва калгасным рухам у рукі тых, хто тайна, ці амаль яўна змагаецца супроць сацыялістычнай перабудовы вёскі праз больш поўнае аграмаджаньне.

У даных умовах востры клясавай барацьбы ва ўсю шырыню паўстае пытаньне аб працы з беднатой унутры калгасаў.

Сумны вопыт калгасу „Чырвоны мэліаратар“, дзе панавала кулацкае засільле, паказвае, што беднякоў і батракоў у калгасах часам ператвараюць у калгасьнікаў „другога разраду“.

Сплаціць беднату ў моцна спаяную сацыяльна-клясавую групу, узьняць яе ўдзельную вагу, узмацніць яе эканамічную і палітычную магутнасьць— вось асноўныя шляхі працы сярод беднаты ў калгасах.

Мэханічнае перанясеньне ў сярэдзіну калгасаў тых мэтадаў работы з беднатой, якія ўжываюцца на-за калгасаў, вядома, недапушчальна. Патрэбны новыя формы, якія-б, не вызначаючы бядняцка-батрацкую праслойку калгасьнікаў у нейкую арганізацыйную групу, якая супроцьстаўляе свае інтарэсы адсталай часьці калгасу, былі прасякнуты клясавым зьместам, узьнялі ўдзельную вагу беднаты і дапамагалі вырашчваньню калгаснага актыву з бядняцкага асяродзьдзя.

«Тэарэтыкі» Дзямідаўскага тыпу прапануюць весьці працу з беднатой унутры калгасаў на падставе калгаснага статуту.

Уся ўстаноўка Дзямідава і іншых невядомых „практыкаў і тэарэтыкаў“ калгаснага руху, якія шчыра абараняюць пад рознымі выглядамі, за дапушчэньне ў калгасы кулака, выходзяць з глыбока фальшывага і памылковага ўяўленьня аб тым, што ў калгасе ўсе роўныя. Няма нічога больш ганебнага па сваёй апартуністычнай сутнасьці, як прадстаўленьне аб поўнай роўнасьці ў калгасах, аб перамозе няроўнасьці толькі шляхам калгаснага статуту, галасаваньня і інш. мер, зусім нязьвязаных з клясавай барацьбой.

Кулацка-заможная частка калгасу вядзе шалёную барацьбу супроць аграмаджваньня сродкаў вытворчасьці, усялякімі шляхамі імкнучыся выкарыстаць выгоды і перавагу калгасу дзеля асабістага абагачэньня, прыбягаючы дзеля гэтага да эксплёатацыі батракоў і беднякоў.

Жыцьцё гаворыць, што роўнасьць у калгасах на данай стадыі іх разьвіцьця, ня больш, ня менш, як фантазія, поўнае самаашуканства.

Навучаць роўнасьці ўнутры калгасаў, гэта значыць ня відзець клясавых праслоек, клясавай барацьбы паміж імі; гэта значыць прайсьці міма сацыяльна-клясавага зьместу калгаснага руху.

Пропаведзь пад лёзунгам «у калгасе ўсе роўныя»—ёсьць выяўленьне вузкага дзялячаства, адарванага ад сацыяльна-клясавых працэсаў і таму небясьпечнага. На практыцы гэта дзялячаства прыводзіць да таго, што ў некаторых калгасах гасп.-эканамічныя мерапрыемствы праводзяцца па-за ўсякай сувязі з клясавай лініяй.

Тав. Кантар, які вывучае практыку калгаснага руху ў раёнах суцэльнай калектывізацыі на Украіне ў сваіх нарысах у „Праўдзе“ паказаў, што практычнае ажыцьцяўленьне лёзунгу «ў калгасе ўсе роўныя» прыводзіць на справе да эксплёатацыі беднаты. Члены калгасу плацяць за абмалотку хлеба машынатрактарнай станцыі па 1,4 кілёграма зярна з 16,4 кгр. абмалочанага зярна. Норма аплаты аднолькава для кулака, серадняка і бедняка, тады як па нормах Наркамгандлю Украіны з бедняка за абмалот хлеба павінны браць толькі сем дзесятых кілёграму. У наяўнасьці факт эксплёатацыі беднаты і сераднякоў заможнай часткаю.

Пытаньне аб кулаку, які ідзе ў калгас з мэтаю разлажэньня калгасу, з мэтаю індывідуальнага абагачэньня, ня так просты, якім ён здаецца некаторым „тэарэтыкамі практыкам“ калгаснага руху.

Унутры калгаснага фронту вакол утварэньня недзялімых капіталаў, больш поўнага аграмаджваньня, правядзеньня выразнай клясавай лініі разгортваецца жорсткая клясавая барацьба.

Пропаведзь апартуністычных, капітулянцкіх тэорый аб бясклясавых калгасах, аб адсутнічаньні клясавай барацьбы будзе толькі шкодзіць справе калгаснага будаўніцтва. Вось чаму павінна быць абвешчана рашучая барацьба ўсякаму выяўленьню апартунізму ў калгаснай практыцы.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Скрыўленьні клясавай лініі ў ападаткаваньні кулацкіх гаспадарак

Гомель, 30-Х. Праверка ходу індывідуальнага абкладаньня толькі ў трох раёнах акругі выкрыла шэраг абураючых зьявішчаў. Райвыканкомы фармальна аднесьліся да гэтай кампаніі і ўсю працу ўсклалі на загадчыка падатковай часткай.

У выніку ў раёнах выкрыты кулацкія гаспадаркі, якія ня былі абкладзены ў індывідуальным парадку. У некаторых раёнах многія кулацкія гаспадаркі былі недаабкладзены. У Лоеўскім і Брагінскім раёнах кулакам даваліся льготы.

Райкомы партыі ня ўлічылі важнасьці ўсёй гэтай палітычнай кампаніі і не мабілізавалі ўвагі бедняты і серадняцкай часткі сялянства на выкрыцьцё кулакоў і на зьнішчэньне гэтых абураючых зьявішчаў.

За скрыўленьне клясавай лініі па абкладаньню кулацкіх гаспадарак акрвыканком зьняў з працы загадчыка падатковай часткай Брагінскага раёну. Старшыні райвыканкому Данцу абвешчана вымова.

Адначасова абвешчана вымова ўсяму складу акруговай падатковай камісіі за асобныя выпадкі няправільнай адмены спраў кулацкіх гаспадарак і зьнят з працы акруговы інспэктар па сельгаспадатку Гладковіч, які рабіў фармальны падыход да працы і не разумеў сутнасьці абкладаньня кулацкіх гаспадарак.

Уся адказнасьць за правільнае правядзеньне кампаніі па абкладаньню кулацкіх гаспадарак ускладзена на кіраўнікоў акрфінаддзелу, якім даручана ў кароткі тэрмін праверыць усю працу па абкладаньню кулацкіх гаспадарак.

Здалі хлеб і падпісаліся на пазыку.

Хлебазагатоўчая кампанія, якая была разгорнута ў вёсцы Дзербічы, прайшла добра. Плян па здачы хлеба выканан на 120 проц. Бедната прымала актыўны ўдзел па правядзеньні хлебазагатовак. Увесь хлеб здан каапэрацыі.

Апроч гэтага, сяляне падпісаліся на III-ю пазыку індустрыялізацыі. Сялянскі лёзунг „Кожны двор па 5 рублёў“.

Ч.

Страхавая кампанія пад пагрозай зрыву

(Ліст з Магілеву).

29-га кастрычніка скончыўся тэрмін спагнаньня першае паловы страхавых плацяжоў. Да гэтага часу па акрузе павінна было паступіць звыш 750000 рублёў рознага выгляду страхавых налічэньняў. Гаспадаркі, якія абкладзены індывідуальна, павінны былі заплаціць страхоўку яшчэ да 15-га кастрычніка—поўнасьцю.

Але, нягледзячы на тое, што падрыхтоўчая праца ва ўсіх, бяз выключэньня, раёнах сваечасова скончылася,—паступленьне страхавых плацяжоў на 15 кастрычніка па Магілеўшчыне складае толькі 146000 руб., або 10 процантаў.

Крыху наперадзе ідзе толькі Лупалаўскі раён.

А ў вогуле такое становішча пагражае недаспагнаньнем на 1-ае лістапада і зрывам усяе кампаніі.

Вельмі дрэнна, што нават Клімавіцкі раён, займаючы паважнае мейсца ў гаспадарчым жыцьці акругі, за апошнія два гады стаў на адно з апошніх мейсц у страхоўцы.

Напрыклад, сёлета ў той час, калі па ўсіх раёнах датэрміновае паступленьне страхоўкі складае ад 3 да 13 тысяч руб., па Клімаўшчыне паступіла толькі... 37 р.

Усё гэта кажа аб тым, што райвыканкомы яшчэ не раскачаліся і ня прымаюць ніякіх захадаў да спагнаньня са страхавых недаімшчыкаў, сярод якіх, бязумоўна, ёсьць значная частка заможных, абкладзеных у індывідуальным парадку.

Трэба і сельсаветам, і РВК безадкладна ўзварухнуцца і шчыра ўзяцца за ўзмацненьне тэмпу гэтай важнай кампаніі на вёсцы.

Леванід Свой.

Самаабкладаньне на 1929-30 год.

Ворша, 31-Х. Па самаабкладаньню на 1929-30 год па Аршанскай акрузе мяркуецца сабраць 484.971 руб. Апошні пленум акрвыканкому гэту суму разьмеркаваў па раёнах, улічваючы эканамічнае становішча кожнага раёну. Разьмеркаваньне кантрольнай лічбы па сельсаветах будзе праводзіцца райвыканкомамі, таксама ўлічваючы эканамічнае становішча кожнага сельсавету, з разрахункам, каб агульная сума самаабкладаньня не перавышала 50 проц. налічнага сельгаспадатку і прыбытковага падатку па сельсавету.

Усе сродкі, якія паступяць ад самаабкладаньня, мяркуецца разьмеркаваць так: на патрэбы сельскай гаспадаркі 72.739 р., або 15 проц., на ахову здароўя 24.241 р. або 5 проц., на пажарную ахову 48.489 р. або 10 проц., на шляхавае будаўніцтва 24.241 р. або 5 проц. і на патрэбы асьветы—295.261 р., або 65 проц. да агульнай сумы самаабкладаньня.

Кампанія па правядзеньню сходаў па ўстанаўленьню сум самаабкладаньня па ўсіх вёсках і мястэчках будзе скончана да 15 лістапада. Налічэньне сум і даручэньне паведамленьняў павінна быць зроблена да 1-XII-29 г.

Для спагнаньня самаабкладаньня ўстаноўлена два тэрміны: першы 15-XII, да якога павінна паступіць 60 проц. самаабкладаньня і другі тэрмін—15-I-30 г., да якога павінны быць узысканы астатнія 40 проц.

Акрвыканком даручыў райвыканкомам, гарадзкім, сельскім і мястэчковым саветам забясьпечыць поўнасьцю правядзеньне клясавай лініі па самаабкладаньню, устанавіць кантроль за выкананьнем дырэктыў па самаабкладаньню і сваечасоваму яго правядзеньню, а таксама забясьпечыць поўнае і сваечасовае скарыстаньне сродкаў па самаабкладаньню на тыя мэты, на якія яно прызначана.

Раённыя і сельскія рэвізыйныя камісіі і сэкцыі саветаў павінны будуць сваечасова і больш дасканала правяраць працу саветаў па спагнаньню, належнаму захаваньню і адпаведнаму скарыстаньню сродкаў па самаабкладаньню.

А. К.

„Мяне голымі рукамі ня возьмуць“.

Наш гэрой загадч. Талочынскім райземаддзелам Кардовіч Язэп Мітрафанавіч. Ён даўно заслужыў гэта ганаровае званьне.

Яшчэ будучы зусім маленькім начальнікам старшынёй Друцкага с.-савету, ён ня раз прамільгваў на старонках беларускіх газэт і ўзнагароджан за „адвагу“ рознымі гучнымі эпітэтамі, накшталт: „Ваенізатар з Друцку, Паляўнічы“ і інш. І што вы думаеце? Што з гуся вада. „Напляваць мне на газэтную крытыку-самакрытыку, мяне сьледчыя органы і Талочынскі нарсуд голымі ня возьмуць“—так апавядае наш „гэрой“.

І праўда, у нарсудзе ёсьць крымінальная справа № 778 за 1928 г. па адзнакам 154 арт. Крымінальнага Кодэксу за параненьне „гэроем“ у п'яным выглядзе камсамольца Дардзіка. Устаноўлена параненьне, але суд знайшоў неабходным спыніць справу з прычыны прымірэньня.

Ёсьць у нарсудзе і другая справа за № 253—1929 г. па адзнакам 207 арт. Крым. Код., але гэта справа таксама, як і першая, спынена. Застаецца вінаватым адзін лесапарубшчык Белахвосьцік.

А дзе-ж Кардовіч? Як ён з гэтай справы ўвільнуў? Як быццам хабарніцтва не даказана, але нашто выдаў Кардовіч дазвол Белахвосьціку зрубіць два дубы на сваёй палаце праз месяц пасьля таго, як ужо Белахвосьцікам была зроблена парубка ў дачы Талочынскага лясьніцтва на суму 214 р.

Кардовіч зьяўляецца шкоднікам калектывізацыі, сам выбыў з калгасу Дуцк, узяў усю сваю маемасьць без устаноўленага разьліку. Спэкуляваў мукой, прадаў Палякову (с. Друцк) па 8 р. пуд.

Мы ўсё-ж такі спадзяемся, што пракуратура рэспублікі запатрабуе вышэйуказаныя справы ў парадку нагляду і па заслугах пакарае Кардовіча.

Псэўдонімаў.

Археолёгічныя досьледы.

Гомель, 30-Х. У верасьні і кастрычніку архэолёгам І. Х. Юшчанка зроблены археолёгічныя досьледы ў Камарынскім раёне, Гомельскай акругі.

Па берагох рэк, якія працякаюць праз Камарынскі раён: Дняпро, Брагінка з прытокамі Несьвіж і Лебедзеўка і па дзюнах на балатох ім адкрыта: 32 стаянкі першабытнага чалавека, 4 старажытніх селішчы, а таксама апісана 8 гарадзішч і 22 курганы.

Частка стаянак адносіцца да Новакаменнага веку (неоліт), а большасьць —да Бронзавага пэрыяду; гарадзішчы падзяляюцца на 2 тыпы: больш позьнія і ранейшыя; курганы, відаць, належаць да 9-11 стагодзьдзя.

Увесь матар'ял, здабыты досьледамі, паступіў у катэдру археолёгіі Беларускай Акадэміі Навук.

Арх. І. Юшчанка.

Арганізован прамтрэст.

Віцебск, 30-Х. Арганізован гарадзкі прамысловы трэст («Віцкамтрэст») у складзе—абутковай фабрыкі «Самаход», фабрыкі грутай мэблі, друкарні „Камінтэр“, лесапільнага заводу № 3 і іншых дробных прадпрыёмстваў.

Раён суцэльнай калектывізацыі.

Віцебск, 30-Х. Сіроцінскі раён вызначан для суцэльнае калектывізацыі. Акрамя, таго на суцэльную калектывізацыю ў кожным раёне намечана пераравесьці па аднаму сельсавету.

Напярэдадні перазаключэньня калдагавораў.

У сучасны момант пытаньне праверкі калдагавораў на нашых фабрыках і заводах разам з пытаньнем праверкі сацыялістычнага спаборніцтва мае актуальнае значэньне. Пытаньні ўзьняцьця вытворчасьці працы, зьніжэньня сабекошту, памяншэньня браку, паляпшэньня культурна-бытавога стану рабочых упіраюцца ў пытаньне ажыцьцяўленьня калдагавораў і дагавораў па сацыялістычнаму спаборніцтву.

Усё гэтае гаворыць за шырокую мабілізацыю рабочай грамадзкасьці вакол гэтых двох пытаньняў.

Абгаварваем ліст Днепрапятроўскіх рабочых.

На заводзе „Энэргія“ падрыхтоўчая праца на агляду калдагавораў пачалася з 18 кастрычніка. З актаў рабочых склалі агульна-завадзкую брыгаду для праверкі калдагавору ў ліку 21 чал. Брыгада падзялілася на некалькі груп, якія будуць правяраць паасобныя пункты, разьдзелы выкананьня калдагавору. З брыгадаю вядзецца праца; зроблена 24 кастрычніка інструкцыйная нарада. Ёсьць меркаваньне завкому некалькі рабочых аслабаніць ад працы і ўтварыць каротка-тэрміновыя курсы з тым, каб даць гэтым рабочым належную падрыхтоўку для працы па агляду.

Падагуленыя вынікі працы брыгады будуць заслуханы разам з дакладам дырэктара на завкоме, а таксама і на агульным сходах рабочых. Насьценгазэты заводу слаба адбіваюць падрыхтоўчую працу па агляду калдагавору. Некаторыя арганізацыі заводу таксама прымаюць слабы ўдзел.

Прачытаўшы ліст днепрапятроўцаў, рабочая маса заводу актыўна ўзялася яго абгаварваць і рыхтуе адказ у друку.

На заводзе „Бальшавік“ не сьпяшаюцца.

На гарбарным заводзе «Бальшавік» вельмі павольны ўзяты тэмп падрыхтоўкі агляду калдагавору. Пытаньне толькі нядаўна прайшло праз пасяджэньне завкому. Ня ўтвораны рабочыя брыгады. Наогул завком лічыць аднесьці самую праверку калдагавору да канца лістапада, пасьля праверкі і агляду дагавароў сацыялістычнага спаборніцтва.

Вельмі добра, што шматтыражка заводу „Рабочае Вока“ ў час прыстасавала сваю працу да запатрабаваньняў праверкі калдагавору. Найбольш актыўныя рабочыя, рабкоры заводу ў сваіх допісах абгаварваюць калдагавор.

Выяўляецца, што ахова працы адміністрацыяй не праводзіцца, напрыклад, у лаечным цэху няма вэнтыляцыі, душ працуе ненармальна. У мэханічным цэху няма аптэчкі. Для дваравых рабочых няма разьдзявалкі. Часта дваравыя рабочыя працуюць звыштэрмінова бяз згоды з камісіяй аховы працы. У сталоўцы часта бывае брудна.

У сушыльным аддзяленьні на 3-м паверсе, дзе застанаўліваецца пад'ёмная машына, падлога зусім слабая, а па гэтай падлозе качаюць вагонэткі з грузам да 100 пудоў, вось чаму можа здарыцца абвал. Спэцвопратка шыецца дрэнна і каштуе дорага. Такіх фактаў можна налічыць і больш. Завкому і іншым заводзкім арганізацыям трэба ўзяць больш хуткі тэмп працы па агляду калдагавору. Трэба большую масу рабочых уцягваць у гэтую працу.

На дражджавым заводзе „Красная Заря“.

Праверка дагавору прайшла. Рабочыя, галоўным чынам, гаварылі, што адміністрацыя не паклапацілася аб спэцвопратцы. Іншых заўваг рабочыя ня ўносілі. Гэта трэба лічыць ненармальным. Наогул увага рабочых заводу не мабілізована была вакол гэтых пытаньняў. Праверка прайшла неяк па „габінэтнаму“.

Недахваты праверкі калдагавораў.

Галоўныя недахопы наступныя: праверка калдагавароў штучна адрываецца ад праверкі дагавароў сацыялістычнага спаборніцтва. Мала ўцягваецца ўся маса рабочых у працу праверкі калдагавароў і заводзкія арганізацыі.

Трэба ўзяць прыклад з прадпрыёмстваў, якія паставілі калдагаворную кампанію, як масавую гаспадарча-палітычную кампанію, напрыклад, з заводу «Серп и молот» у Харкаве, дзе ўвесь завод быў уцягнут у гэтую працу.

Хв. Падрэцкі.

ХРОНІКА.

Жанчыны-дэлегаткі папаўняюць шэрагі камуністычнай партыі.

ВЫПУСК ДЭЛЕГАТАК КАСТРЫЧНІКАЎСКАГА РАЙЁНУ.

31 кастрычніка ў клюбе імя Карла Маркса адбыўся ўрачысты выпуск 620 дэлегатак Кастрычнікаўскага раёну мінулага скліку.

Ва ўступнай прамове сакратар райёнага камітэту партыі т. Конюхаў ахарактарызаваў грунтоўныя шляхі разгортваньня нашага сацыялістычнага будаўніцтва і надкрэсьліў асаблівую неабходнасьць удзелу ў гэтым жанчын—работніц.

Асобныя выпускніцы апавядалі аб шматлікіх дасягненьнях, атрыманых імі ў часе прабываньня дэлегаткамі.

— Дэлегацкія сходы, — кажа т. Штайман,—далі мне магчымасьць зразумець, што толькі камуністычная партыя вядзе рабочую клясу па правільным шляху.

—Будучы дэлегаткай,--кажа работніца А. Мацюж Зося,—я ўпэўнілася ў правільнасьці Ленінскага шляху камуністычнае партыі.

Я зараз папоўніла сваё агульна-палітычныя веды і жадаю ўступіць у партыю.

Дэлегаткі адзінадушна падтрымалі хадатайніцтва т. Мацюж і, з свайго боку, рэкамэндавалі яе ў партыю.

Іншыя прамоўцы таксама адзначалі, што дэлегацкія сходы зьяўляюцца школай падрыхтоўкі актыўных жанчын-грамадчыц.

Гутарка т. Галадзеда з групаю калгасьнікаў.

Учора, 1-га лістапада, старшыня СНК т. Галадзед прыняў групу калгасьнікаў Менскай, Бабруйскай, Магілеўскай і інш. акруг. Гутарка працягнулася некалькі гадзін.

Да кастрычнікавых сьвят.

Прафсаюзныя арганізацыі падрыхтоўваюць масавыя выезды ў час кастрычнікавых сьвят у падшэфныя вёскі, калгасы і саўгасы.

Апроч гэтага, мае быць арганізавана экскурсія ў Маскву для ўдзелу ў кастрычнікавых сьвятах. У экскурсіі прыме ўдзел да 600 рабочых г. Менску.

Прымацоўваньне навучальных установ да фабрык і заводаў.

У мэтах лепшай сувязі студэнцтва з рабочымі ЦБ пралетстуду пастанавіла прымацаваць асобныя навучальныя ўстановы да фабрык і заводаў для дапамогі ў культпрацы, ліквідацыі няпісьменнасьці і г. д.

9.000 руб. на працу сярод сэзоньнікаў.

ЦП саюзу будаўнікоў адпусьціла 9.000 руб. на ўзмацненьне культмасавай працы сярод рабочых-сэзоньнікаў. Грошы разьмеркаваны па акраддзяленьнях саюзаў.

Падрыхтоўка кваліфікаваных рабочых будаўнікоў.

У бягучым гаспадарчым годзе па акруговых гарадох БССР арганізоўваюцца курсы ЦП'у для падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых будаўнікоў.

Праз курсы мяркуецца прапусьціць 5160 чалавек.

Новы тэатр для абслугоўваньня раённых гарадоў.

Прэзыдыум саюзу Белпрацмастацтва ўзьняў перад кіраўніцтвам працкалектывамі пытаньне аб арганізацыі новага тэатру для абслугоўваньня раённых гарадоў Беларусі.

Сваечасова падрыхтуем прадпрыемствы да прыёму току Асінбуду.

На паседжаньні Віцебскага акрплянстатбюро быў заслухан даклад тав. Шаршнёва аб ходзе будаўніцтва Асінаўскай дзяржаўнай раённай электрастанцыі імя тав. Сталіна і падрыхтоўкі абанэнтаў да прыёму яе току.

Галоўнае заданьне—пабудова каркаса—ужо выканана. Скончаны таксама жалезабэтонныя работы і ўся будаўнічая частка. Паасобныя тэхнічныя пабудовы, як паравознае дэпо, майстэрні, склады матар'ялаў, пад'ездныя дарогі—таксама скончаны. Жыльлёвае будаўніцтва, якое мае асоба выключнае значэньне ва ўмовах разьвіцьця Сталінбуду, скончана. Маюцца тры 3-хпавярховыя дамы.

Работа на тарфяным балоце вядзецца з такім разьлікам, што 4,5 мільёнаў куб. мэтраў торфу (гадавая патрэба торфастанцыі) будзе падрыхтавана да моманту пуску Сталінбуду.

Лініі перадачы па трасам Арэхі—Віцебск, Балота—Дуброўня і Арэхі—Шклоў праведзены. Сканчваецца пабудова лініі на Воршу.

Пабудова паніжальнай і павышальнай падстанцыі сканчваецца. Віцебская падстанцыя ў аснове гатова. 90 проц. патрэбных матар'ялаў атрымана.

У жніўні 1930 году станцыя будзе пушчана ў ход, а ў кастрычніку Віцебск атрымае ток.

Моцнасьць току па Віцебску вызначана ў 8.242 кілёват, пры аднaчасовым максімуме 6.400 кілёват. Спажываньне энэргіі за год вызначаецца ў 20 мільёнаў кілёват-гадзін. Праэкты па электрафікацыі маюць 23 прадпрыемствы.

Шмат прадпрыемстваў ужо атрымалі маторы (Віцшвэй, „Дзьвіна“, панчошная фабрыка) і забясьпечаньне ў далейшым маторамі спрыяючае. Кепска абстаіць справа з мантажам. На гэты час толькі тры прадпрыемствы электрафіцыраваны: дражджзавод, скурзавод і акуляравая фабрыка, што складае толькі 12 проц. усёй працы па мантажу.

Як недахоп, трэба адзначыць, што да сёньняшняга дню ў Віцебску няма мантажнага бюро.

Праэкт сельскай электрафікацыі атрымаў сваё вырашэньне толькі ў самы апошні час, бо ён меў зьмену ў сувязі ўвязкі яго з плянам калектывізацыі і капэрыраваньня сельскай гаспадаркі.

Парадачкі на Антонаўскім убойным пункце.

Добрую справу распачаў Дзяржгандльбел—арганізацыю птушкаадкормачнага—убойнага пункту экспартнага значэньня.

Распачалася работа, але ўжо з першых дзён існаваньня гэтага пункту там пачаліся непаразуменьні: поўны хаос з кармам, корм атрымоўвалі з розных бакоў, бо Дзяржгандльбел сыгналізаваў: „ратуйце птушак, паміраюць з голаду... і хлебафуражныя арганізацыі, спалохаўшыся гістэрычнага крыку Дзяржгандльбелу, пачалі адгружаць у Антонаўскі пункт усякія кармы для птушак. Антонаўскія адміністратары не маглі справіцца з гэтай справай і кормачныя грузы валяліся або на станцыі, за якія плацілі вялікія грошы за прастой, або пад адкрытым небам. Безгаспадарчасьць расла з кожным днём і ня было сур'ёзнага нагляду. Антонаўскія адміністратары па цэлых днёх бегалі ў праўленьне за „дырэктывамі“, а праўленьне само ня ведала што рабіць.

Добрыя і будаўнікі гэтага пункту: вады няма, птушкі могуць быць пакінуты без вады ледзь на працягу 18-20 гадзін, робяцца дохлымі, бяз крыві і кожны дзень разьвітаецца з жыцьцём вялікая колькасьць гусей і кур.

А сама работа пункту, убой, сартыроўка, апрацоўка? Трэба прызнацца, што толькі ў самыя апошнія дні заўважваецца некаторы зрух у гэтай працы. Спэцыяліст Мар'янаў наогул нікога не прызнае, працуе па-свойму, вэтурач халадзільніку, куды прыбываюць птушкі, часта скардзіцца на кепскую апрацоўку птушак, а спэц спакойна адказвае: „Яны нічога не разумеюць, а я, вось, правільна паступаю“...

Спэц Мар'янаў „правільна“ паступае, ну, а куры здыхаюць, або ў лепшым выпадку паступаюць на пункт сінімі...

Ёсьць дрэнныя зьявішчы і пры адпраўках кур з пунктаў Дзяржгандльбелу. Пры кожным паступленьні птушак з пунктаў выяўляецца, што яны паступаюць у палудохлым стане.

Адна справа такая ўжо перададзена пракуратуры, але амаль-што ні кожны дзень, а колькі грошай гэта каштуе Дзяржгандльбелу?

Звыштэрміновая праца рабочых, амаль што не да позьняй ночы без дазволу саюзу, бяз санкцыі інспэкцыі мае вельмі часта мейсца.

А як-жа інакш? Корм трэба цягаць з аднаго месца ў другое, здохлых кур трэба выкідаюць, слабым, якія яшчэ дышуць, трэба вярнуць жыцьцё.

Тут вінаваты ня толькі пункты Дзяржгандльбелу, якія нядбайна адсылаюць птушку, але і чыгунка, якая не захоўвае правіл пры адпраўцы птушкі. Чыгунка адгружае тавар у вагонах з зачыненымі люкамі, дазваляе садзіць кур колькі ўлезе, быццам вязуцца бочкі з селядцамі.

Праўленьне Дзяржгандльбелу за апошні час пачало больш сур'ёзна прыглядацца да работы пункту, вызначыла загадчыка пункту здольнага працаўніка—партыйца і толькі зараз пачынаюць зьвяртаць увагу на тыя хібы і дэфэкты, якія ўвесь час маюць месца на гэтым пункце, але гэтага мала. Неабходна рэарганізацыя гэтай справы. Дзяржгандльбелу неабходна ўжыць самыя суровыя меры, каб куры або гусі прыбывалі на пункт у добрым выглядзе, каб вада для птушкі была ў дастатковай меры, корм не валяўся спэцыяліст Мар'янаў падпарадкаваўся патрабаваньням вэтурача. Гэта трэба зрабіць і як мага хутчэй.

Вока.

У Эканамічнай Нарадзе пры СНК БССР.

Плян нарыхтоўкі бульбы на 1929-30 год.

Эканамічная Нарада ўстанавіла, што для правядзеньня пляну павінны працаваць наступныя арганізацыі: Белсельсаюз, Белкапсаюз, Саюзхлеб, Хладацэнтр, Белдзяржсьпірт, Белсельтрэст, Белхарчтрэст і Прадуктперапрацоўка.

Устаноўлены тэрміны выкананьня загатаўчага пляну бульбы для патрэб:

прамысловасьці 70 проц. яе патрэбы да 1-га студзеня, і прамысловасьці 30 пр. да 15 траўня.

Для патрэб насельніцтва 60 проц. да 1-га лістапада, і для патрэб насельніцтва 40 проц. да 1-га чэрвеня.

Рэгуляваньне загатоўчых і збытавых цэн на бульбу праводзіцца Н. К. Гандлю БССР праз канвэнцыю бульбазагатавіцеляй (рэспубліканскіх і мясцовых).

Скарыстаньне ў бульбазагатоўках прыватнага пасярэдніка Эканамічнай Нарадай забаронена ўсім без выключэньня бульбазагатавіцелям.

Пабудова заводу па выпрацоўцы бульбяных хлоп'яў.

На пасяджэньні ад 21-Х Эканамічная Нарада прызнала неабходным пабудаваць у 1929-30 годзе завод па выпрацоўцы бульбяных хлоп'яў магутнасьцю на перапрацоўку ня менш 8200 тон бульбы.

Найбольш мэтазгодным пунктам для пабудовы гэтага заводу прызнаны раён калфонду Мар'іна.

Пра далейшае існаваньне рамонтна-паверачных майстэрняў Беларускае Палаты Мер і Вагі.

Цэнтральныя рамонтна-паверачныя майстэрні Беларускай Палаты Мер і Вагі з усімі яе мясцовымі арганізацыямі ў акругах перадаюцца, згодна дырэктыў ЭКАНА, у веданьне мясцовай прамысловасьці па папярэднім узгадненьні пытаньня аб перадачы з кожным акрвыканкомам.

Аддзяленьне для вырабу мэтраў, якое існавала пры Палаце Мер і Вагі, перадаецца Лесбелу, які прымае яго ў сваё веданьне ў якасьці арганізацыйнай ячэйкі будучай фабрыкі па вырабу мэтраў.

Пра прадастаўленьне Заходнім чыгункам права самастойных загатовак лесу ў БССР.

Эканамічная Нарада, разглядзеўшы гэта пытаньне, знайшла мэтазгодным дазволіць Кіраўніцтву Заходніх чыгунак займацца самастойнымі загатоўкамі драўніны ў БССР у 1929-30 г., на што ім адпушчана 100000 к.-м.

Рабселькоры нам пішуць.

Арганізуемся ў калектывы.

У Жалавінецкім сельсавеце, Глускага раёну, Бабруйскае акругі да апошняга часу калгасны рух не пашыраўся. Цяпер-жа ў нашым сельсавеце бядняцтва і серадняцтва падаюць масавую калектыўную заяву аб уступленьні ў калгасы.

В. Мішур.

Крычаўскае крэдтаварыства, прасьніся!

Праўленьне Крычаўскага крэдтаварыства не зьвяртае ніякае ўвагі на выкананьне ўмоў па контрактацыі розных культур збожжа, спадзяючыся на самацёк. Контрактацыя пад пагрозай зрыву. РВК і іншыя арганізацыі павінны зьвярнуць на гэта ўвагу.

Шчакалоў.

Безгаспадарчасьць.

Пры Нова-Барысаўскім сельска-гаспадарчым тэхнікуме знаходзіцца фэрма для практычнай працы студэнтаў. Асеньняя пасяўная кампанія на фэрме праведзена са значным спазьненьнем. Бульба была вясною пасаджана таксама позна. Былда ўсё хворае на сухоты. Купілі хворага каня, які хутка прападзе. Каля фэрмы валяецца і гніе куплены лес. Гэткі лёс спаткаў націну (батву) буракоў і бульбы. Адміністрацыя глядзіць на ўсё гэта, заплюшчыўшы вочы.

Эм.

Будуем 2-хкамплектную школу.

У Сакаловіцкім сельсавеце, Крупскага раёну, Аршанскае акругі на сродкі самаабкладаньня будзе пабудавана двохкамплектная школа. І ў мінулым годзе і ў сёлетнім самаабкладаньне паступае здавальняюча.

Гармозінскі Я.

Пазыка індустрыялізацыі пад пагрозай зрыву.

Рэалізацыя 3-й пазыкі ў Койданаўскім раёне, Мен. акр. праходзіць зусім дрэнна. Да гэтага часу рэалізавана ўсяго 20 процантаў заданьня. Толькі адзін Палоневіцкі сельсавет выканаў сваё заданьне з перавышэньнем. Непасьпяховасьць рэалізацыі пазыкі тлумачыцца слабаю працаю ўстаноў і арганізацый раёну, якім трэба свае хібы выправіць.

Макарэвіч К.

На пабудову танка імя газэты „Камуніст“.

Сяляне вёскі Дубея Старобінскага раёну Бабруйскае акругі сабралі 14 пудоў 25 фунтаў жыта, якое здалі ў каапэрацыю. Грошы пашлі на пабудову танка імя газэты „Камуніст“.

Шарко.

Арганізавалі вялікі калгас.

Як ні стараліся кулакі вёскі Дзербічы Буда-Кашалёўскага раёну Гомельскай акругі сарваць арганізацыю калгасу—бедната супольна з лепшымі серадняками далі ім рашучы адпор і арганізавалі вялікі калгас „Пралетары“ на 1000 гэктараў.

Чэчора.

Бедната арганізавала калгас.

Кулак Нічыпаровіч, пражываючы ў Песачанскім сельсавеце Капыльскага раёну за контр-рэвалюцыйную дзейнасьць бывысланы з межаў БССР, а на яго былай зямлі бедната арганізавала калектыў. Калектыў налічвае звыш 100 гэктараў ворнае зямлі і сенажаці. У калектыў увайшло 15 бедняцкіх гаспадарак з мястэчка Пясочная.

Міхась.

Чакаем адказу...

Так гавораць сябры калгасу „Ленінец“, бо прайшло больш двух месяцаў, а выкліканы на сацыялістычнае спаборніцтва калгас „Расьсьвет“ Капыльскага раёну не дае ніякага адказу.

Вандроўны.

Не сталоўка, а крама.

Самахвалавіцкі КСУ арганізаваў грамадзкую сталоўку. У сталоўцы можна дастаць піва і мёд, але абеды і гарбата бываюць толькі 2 разы ў тыдзень. Пьюць там і гарэлку. Адным словам—карчма, ды годзі!

Мол—в.

Прышлеце нам доктара!

Гарадзішчанскі ўрачэбны пункт абслугоўвае 12 тысяч насельніцтва. Штодня пункт наведвае каля 200 хворых. Фэльчар ня можа адзін справіцца. А доктар і акушэрка вось ужо два месяцы, як выехалі ў другое месца. Трэба тэрмінова прыслаць доктара!

Д. Х.

Апавяшчэньні.

„АПА Менакругкому КП(б)Б паведамляе, што пачаўся прыём заяў на завочнае навучаньне ў інстытуце Чырвонай Прафэсуры і Камакадэміі. Правілы прыёму „Правда“ № 240 ад 17-Х-29 г.

„АПА Менакругкому КП(б)Б даводзіць да ведама, што з 10-га лістапада пачынае сваю працу дэкадны Камвуз (ранейшы нядзельны). У Камвуз прымаецца партактыў раённага, акруговага і цэнтральнага маштабаў, а таксама партактыў савецкіх, прафсоюзных, гаспадарчых і грамадзкіх арганізацый гэтага маштабу“. У Унівэрсытэце будзе існаваць тры аддзяленьні: гістарычнае, эканамічнае і філязофскае. Курс навучаньня—1 год. Таварышы, жадаючыя паступіць у Унівэрсытэт, павінны да 7-га лістапада падаць заявы ў РК КП(б).

— Пры 20 фабр.-заводзкай школе „Імя Х-цігодзьдзя БССР“ адчынілася з 1 лістапада 8-я група 10-годкі.

Прыём заяў ад рабочых, жадаючых залічыць сваіх дзяцей, працягнут да 10 лістапада.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

Сёньня а 7 гадзіне пасяджэньне праўленьня дому.

— 2-Х (у суботу) а 8 з паловаю гадзіне вечару адбудзецца пасяджэньне таварыства гісторыкаў марксыстых у Ленінскім габінэце Камвузу. Пытаньні: 1) Даклад Югава аб 3—юльскім рэжыме (сталыпіншчына) у ацэнцы Леніна. 2) Арганізацыйныя пытаньні. Апрача членаў таварыства запрашаюцца настаўнікі, студэнты і ўсе, хто цікавіцца.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ

Праверка і чыстка ячэйкі КП(б)Б пры ЦВК і СНК БССР
АДБЫВАЕЦЦА
У КЛЮБЕ «САМАТУЖНІКАЎ» (Ракаўская вул.) а 6 гадз. увеч.
ЗАПРАШАЮЦЦА ЎСЕ РАБОЧЫЯ І СЛУЖАЧЫЯ
БЮРО ЯЧЭЙКІ.

Дом Пісьменьніка.
2-га лістапада а 8-й гадзіне ўвечары ў Доме Пісьменьніка (Савецкая, 68) адбудзецца агульны сход пісьменьнікаў гор. Менску.
У парадку дня:
1) Пераабраньне старшыні Праўленьня Дому Пісьменьніка.
2) Бягучыя справы.
Уваход вольны.

Дом Пісьменьніка.
У панядзелак 4 лістапада ў Доме Пісьменьніка (Савецкая, 68) ад 5 да 7 гадзін увечары адбудуцца заняткі марксыцка-ленінскага гуртка пад кіраўніцтвам т. Сякерскай.
Тых, хто запісаўся ў гурток, просьба зьяўляцца сваечасова.

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА“. З панядзелка 28 кастрычніка „РАЗЛОМ“ Звыш праграмы: кіно-хроніка № 56.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». З панядзелка 28 кастрычніка мастацкі фільм „Як часам бывае“ драма ў 6 частках. Звыш праграмы: Хроніка савкіно № 58.

1-Ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР“. З панядзелка 28 кастрычніка „ЛЯСНЫЯ ЛЮДЗІ“ Краязнаўчы нарыс у 5 частках. Звыш праграмы: Кіно-хроніка „СОВКІНО“.

КІНО „ПРАЛЕТАРЫ“. З панядзелка 28 кастрычніка нямецкі фільм „ГОРНАЯ БАЛЯДА“ у 7-мі частках. Пачатак а 7 гадзіне.

Згублен членскі білет № 203 члена Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР тав. СУПРУНА КУЗЬМЫ ХАРЫТОНАВІЧА, выдадзены ЦВК БССР, які лічыць ня маючым моцы.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Квіт. Зелянецкага л-ва на вывозку лесаматар'ялаў ад 15-III—29 г. за №№ 1641, 1642 на суму 51 р. 20 к. на імя Процка М. К.
— Хлебная картка Карнейца В. Ю.—выд. Калінкавіцкім -паж. т-вам.
— Асабова-вайсковая картка Жураўеля А. А.—выд. Калінкавіцк. Райваенкаматам.
— Паявая кніжка № 2238 Барэйша А. І.—выд. Калінкавіцк. спаж. т-вам.
— Вучотна-конская карт., выд. Калінкавіцк. РВК і паявая кніжка, выд. Калінкавіцк. с.-гасп. на імя Далжонка Д. І.
— Асабовае пасьведчаньне Бухмана Х. І.—выд. Калінкавіцкім Гарсаветам.
— Паявая кніжка № 437 Гутэрмана—выд. Калінкавіцк. спаж. т-вам.
— Вучотна-конская карт. Вайсман І. М.—выд. Юравіцкім РВК.
— Паявая кніжка № 793 Зіновіч С. Н.—выд. Дубіцкім спаж. т-вам.
— Хлебная картка Акуліча М. Н.—выд. Калінкавіцк. спаж. т-вам.
— Вучотна-конская картка № 7514 Пінскага Б. Н.—выд. Калінкавіцк. РВК.
— Пашпарт Шніцман Я. А. нарадж. 1909 г.—выд. Калінкавіцкім РВК.

„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“
БЕЛАРУСКАЯ ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА
ОРГАН Ц. В. К. БЕЛАРУСІ
ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ЛІСТАПАД і далейшыя тэрміны.
Цана асобнага нумару 5 кап.
„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 мес.—90 кап. 6 мес.—4 руб.
3 мес. 2 р. 70 кап. год — 8 руб.
АДКРЫТ ПРЫЁМ ПАДПІСКІ на 1930 г.
Падпіска прымаецца: паштовымі канторамі і аддзяленьнямі, лістаносцамі, упаўнаважанымі канторы газэты, кіёскамі кантрагэнцтва друку і канторай газэты (Менск 2-гі Дом Саветаў).
СЬПЯШАЙЦЕСЯ ПАДПІСАЦЦА

Галоўлітбел 595. Друкарня БДВ.